

# МІНСК — ХАРАРЭ: СТРАТЭГІЯ РАЗВІЦЦЯ

**Новы імпульс узаемадзеянню Беларусі і Зімбабвэ надалі перагаворы двух лідараў**

(Працяг на стар. 2–3)

РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ
ЗВЯЗДА
Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
15 МАЯ 2025 г. ЧАЦВЕР № 92 (30480)

# ШЧАСЦЕ БЫЦЬ РАЗАМ

**Сёння ў Беларусі адзначаецца Міжнародны дзень сям'і**



Праця тэмы на стар. 4–5

Фота носіць ілюстрацыйны характар.

З НАГОДЫ

## У ЦЭНТРЫ ЎВАГІ ДЗЯРЖАВЫ

Міжнародны дзень сям'і быў зацверджаны ААН. Такім чынам міжнародная супольнасць абазначыла выключную важнасць сям'і ў сацыяльна-эканамічных і дэмаграфічных працэсах кожнай краіны свету. У Беларусі на гэтым тыдні праходзіць вялікая колькасць конкурсаў і фестываляў, ладзіцца мноства ініцыятыў, прысвечаных сям'і, якая па праве лічыцца нацыянальным прыярытэтам. Сям'я і дзеці знаходзяцца ў цэнтры ўвагі нашай дзяржавы і атрымліваюць усебаковую падтрымку.



СТАР. 4

ЧЫТАННІ

## ПА-БРАТЭРСКУ, З ДОБРЫМ СЛОВАМ

**XXXI Міжнародныя Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні нагадалі пра агульную сям'ю ўсіх хрысціянскіх народаў**



Перад сцэнай, на якую ўздымаліся ганаровыя госці, — абраз святых братоў Кірылы і Мяфодзія, пра духоўны подзвіг якіх нагадаў Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Веніямін, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі. Тыя, хто прынёс слова Божае на землі славян, былі вялікімі настаўнікамі і асветнікамі, памяць пра якіх жыве ў вяках, іх шануюць хрысціяне, дзе б яны ні жылі і да якой бы канфесіі не належалі. На гэтым сёлета зроблены асаблівы акцэнт у сувязі з 1700-годдзем першага Нікейскага сабору (цяпер яго называюць Усяленскім), які прыняў Сімвал Веры — адзіны для ўсіх хрысціян...

СТАР. 4

## БУДЗЬЦЕ ПІЛЬНЫМІ!

**За заробак на афармленні банкаўскіх картак — крымінальная адказнасць**

У сацыяльных сетках зноў актывізаваліся аферысты, якія прапаноўваюць аформіць карткі расійскіх банкаў, а потым выгадна перапрадаць іх даныя. Аднак трэба ведаць, што такія дзеянні пагражаюць не хуткім заробкам, а адказнасцю па законе.



Міністэрства ўнутраных спраў чарговы раз нагадвае аматарам лёгкіх грошай: у Беларусі забаронена незаконнае распаўсюджванне рэквізітаў банкаўскіх плацежных картак, лагінаў і пароляў, з дапамогай якіх можна атрымаць доступ да рахункаў або электронных кашалькоў.

«Ашуканцы выкарыстоўваюць гэтыя даныя для вываду сродкаў, атрыманых злачынным шляхам, — адзначыў **намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення па супрацьдзеянні кіберзлачыннасці МУС Аляксандр РЫНГЕВІЧ.** — Напрыклад, па вядомай схеме «Алё, мама!» выманьваюць у ахвяры наяўныя грошы, праз банкамат папаўняюць імі картку расійскага банка, а пасля здымаюць наяўныя грошы на тэрыторыі суседняй краіны. Такім чынам асоба, якая перадала свае рэквізіты для гэтай аперацыі, становіцца саўдзельнікам злачынства».

Праваахоўнікі заклікаюць: нікому, ніколі, ні пад якой маркай не перадавайце свае персанальныя даныя. Не верце тым, хто пераконвае, што бізнес па афармленні банкаўскіх картак з'яўляецца бяспечным і абсалютна легальным заняткам.



ШТО ПРАПАНУЕ НАВЕДВАЛЬНІКАМ НОВЫ МВЦ 8



ЦІ ЧАКАЦЬ ЗМЕНЫ ПАЛІТЫЧНАГА КУРСУ Ў ПОЛЬШЧЫ? 8

НАШЫ КАШТОЎНАСЦІ

## «БЫЦЬ МАМАЙ — НАЙВЯЛІКШАЯ РАДАСЦЬ»

**Як жыве маладая сям'я з двума дзецьмі з Віцебска**

Аліна і Яўген Сачак разам пяты год, амаль тры з іх — у афіцыйным шлюбе. І ён, і яна заўсёды марылі аб вялікай сям'і — перад вачыма быў цёплы сямейны прыклад, дзе разам з імі выхоўваліся брацік і сястра. Ужо дарослымі людзьмі Аліна і Жэня стварылі сваю ячэйку грамадства, а плодам іх шчырага і чыстага кахання сталі сынок Цімафей і дачка Аліса.



Героі пазнаёміліся ў 2020 годзе. Жэня, як сапраўдны кавалер, стаў актыўна заваёўваць сэрца дзяўчыны. Аліна, адчуўшы сябе побач з ім як за каменнай сцяной, не стала супраціўляцца. Праз два гады пара пажанілася. Не сталі маладыя цягнуць з нараджэннем дзяцей, у хуткім часе з'явіўся першынец Цімафей.

«Станавіцца мамай у 23 гады было зусім нястрашна. Мы рыхтаваліся да гэтага, планавалі. Цяжарная, я вывучала шмат літаратуры, праходзіла адпаведныя курсы. У першыя дні пасля нараджэння сына, вядома, было складана: баялася няправільна ўзяць дзіця, нашкодзіць. Аднак калі жанчына становіцца мамай, быццам бы прырода сама, як тумблер, уключае ўсё неабходнае», — расказвае Аліна.

Плануючы папаўненне, маладая сям'я спадзявалася толькі на свае сілы. І не таму, што чакаць дапамогі не было ад каго: бабулі і дзядулі з абодвух бакоў заўсёды гатовы падставіць сужэнцам плячо, — а таму, што поўнасцю ўсведамлялі: іх дзеці — толькі іх адказнасць.

Сям'і Сачак пашчасціла: сынок Цімафей аказаўся надзвычай ціхім і паслухмяным дзіцем, таму Жэня і Аліна сталі планаваць дачку. «Паміж старэйшым і малодшай розніца ў год і пяць месяцаў, і мы так захацелі самі. Па-першае, сын даволі самастойны, можа гуляць сам. Па-другое, хацелася нічога не забыць і не страціць навыкі догляду нованароджанага. І адкажу адразу: не, мне не складана. Канешне, цяпер у сына ідзе актыўнае адстойванне самастойнасці ў сувязі з крызісам двух гадоў, а ў цэлым дзеці добра ладзяць, гуляюць разам. У маі Цімафей ужо пойдзе ў дзіцячы садок», — дзеліцца маладая мама.

За два з паловай гады знаходжання ў дэкрэтным адпачынку Аліна прызнаецца, што не стамілася, аднак гэта ўсё роўна напружаная штодзённая, нават штохвілінная праца. Вялікую дапамогу ў выхаванні малых ёй аказвае муж, які і пасля працоўнага дня замяняе жонку бяссоннымі начамі. Каб не засумаваць дома і не страціць свае творчыя навыкі (Аліна па прафесіі мастак-афарміцель-дызайнер інтэр'ера), яна пляце на заказ прадметы інтэр'ера, а з нядаўняга часу яшчэ і стварае развівальныя гульні для дзяцей. Але гэта, па словах маладой мамы, не столькі для дадатковага заробку, колькі для душы.

«На дваіх дзяцей я атрымліваю звыш 1800 рублёў дзяржаўнай дапамогі, больш за дзве тысячы зарабляе муж у адной з будаўнічых арганізацый. Нам гэтага хапае для камфортнага жыцця, тым больш што ёсць сваё жыллё. Мы прадалі двухпакаёку ў цэнтры горада і набылі трохпакаёвую кватэру ў спальным раёне, каб у кожнага з малых была свая прастора і ўсім хапала месца», — расказвае гераіня.

Калі Аліна і Жэня пазнаёміліся, то адразу вырашылі, што іх сям'я будзе вялікай і шчаслівай. Цяпер маладым 25 і 26 гадоў, і іх мара ўжо спраўдзілася. «Не задумваліся над тым, каб пайсці па трэцяе?» — з усмешкай пытаюся ў гераіні, у сэрцах захапляючыся яе смеласцю. «Была такая размова з мужам, і, магчыма, праз пэўны прамежак часу мы адважымся на гэты крок. Але ў найбліжэйшай перспектыве — не, бо, як ні круці, але працаваць мамай пагодкаў «24 на 7» усё ж такі складана», — прызнаецца Аліна.

Усім, хто баіцца ствараць сям'ю і нараджаць дзяцей у маладым узросце, пара раіць унутрана вызначыцца з жыццёвымі мэтамі. Камусьці як мінімум да 30 неабходна быць свабодным ад вузаў шлюбу, а хтосьці, як нашы героі, марылі аб уласнай сям'і з юнацтва. «І я, і Жэня па натуры спакойныя людзі. Ніколі сэнс нашага жыцця не заключаўся ў шумных кампаніях і бясконцых вечарынах. Таму гаварыць аб тым, што хтосьці з нас не нагуляўся, нельга. Мы нічога не страцілі пасля стварэння сям'і, а толькі набылі: адно аднаго, два сонейкі. А маладым дзяўчатам хачу сказаць: калі ў вас ёсць муж, яго падтрымка і дапамога, то баяцца няма чаго. Быць мамай — найвялікшае шчасце», — заключыла Аліна.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**
**Фота з архіва сям'і.**

ISSN 1990 — 763X
25092

Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

# МІНСК — ХАРАРЭ: СТРАТЭГІЯ РАЗВІЦЦЯ

## Новы імпульс узаемадзеянню Беларусі і Зімбабвэ надалі перагаворы двух лідараў

Новыя вектары супрацоўніцтва і магчымасці ў супрацоўніцтве Беларусі і Зімбабвэ адкрыліся пасля перагавораў лідараў краін. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка і Прэзідэнт Зімбабвэ Эмерсан Мнангагва правялі перагаворы ў Палацы Незалежнасці. Лідар Зімбабвэ прыбыў у Беларусь 11 мая. Ён наведаў мемарыяльны комплекс «Брэсцкая крэпасць-герой», азнаёміўся з тэхналогіямі перапрацоўкі малака на прадпрыемстве «Савушкін прадукт». Члены дэлегацый правялі шэраг двухбаковых мерапрыемстваў на ведамасным узроўні, па лініі арганізацый і прадпрыемстваў, грамадскіх арганізацый, дзелавых колаў. Кульмінацыяй візіту сталі перагаворы прэзідэнтаў у Палацы Незалежнасці.



Фота БелТА.

### ШТО ЗВЯЗВАЕ БЕЛАРУСЬ І ЗІМБАБВЭ

Адносіны краін развіваюцца дынамічна, з павагай адно да аднаго і з супадзеннем пазіцый па шэрагу пытанняў. Прэзідэнт Зімбабвэ Эмерсан Мнангагва наведваў Беларусь у ліпені 2015 года ў якасці віцэ-прэзідэнта і ў студзені 2019 года ўжо як кіраўнік дзяржавы. Візіт беларускага лідара ў афрыканскую краіну ў пачатку 2023 года надаў супрацоўніцтву Беларусі і Зімбабвэ новы імпульс. Па выніках таго візіту быў падпісаны пакет дакументаў, якія рэгулююць супрацоўніцтва ў розных сферах. Дасягнутыя дамоўленасці не засталіся на паперы, а хутка атрымалі практычнае ўвасабленне. Пацвярджэнне таму — праграма механізацыі сельскай гаспадаркі Зімбабвэ, у рамках якой беларускі бок паставіў афрыканскай краіне сваю якасную сельскагаспадарчую тэхніку.

Бакі актыўна абменьваюцца візітамі на розных узроўнях. Некалькі разоў Беларусь наведвала першая лэдзі Зімбабвэ Аксілія Мнангагва — на яе сустрэчах з беларускім лідарам абмяркоўвалася супрацоўніцтва ў гуманітарнай сферы. Аксілія Мнангагва шчыра дзякавала беларускім партнёрам за перадачу пераноснага медыцынскага комплексу з рэнтген-апаратам. Яна адзначала, што гэтая мабільная клініка станоўча паўплывала на здароўе насельніцтва, асабліва жанчын.

Наладжана супрацоўніцтва і паміж дзелавымі коламі Зімбабвэ і Беларусі. У красавіку гэтага года Зімбабвэ наведала беларуская дэлегацыя на чале з намеснікам прэм'ер-міністра Віктарам Каранкевічам. Бакі абмеркавалі далейшае супрацоўніцтва, уключаючы рэалізацыю трэцяй фазы праграмы механізацыі сельскай гаспадаркі Зімбабвэ з выкарыстаннем беларускай тэхнікі. Па выніках візіту беларускай дэлегацыі таксама паведамлялася аб планах краін распрацаваць новую ўсёабдымную дарожную карту супрацоўніцтва на 2026—2030 гады.

### ШТО ЗРОБЛЕНА ДЛЯ ЎМАЦАВАННЯ ДВУХБАКОВЫХ АДНОСІН

У Палацы Незалежнасці прэзідэнты Аляксандр Лукашэнка і Эмерсан Мнангагва акрэслілі новыя гарызонты супрацоўніцтва, якія Беларусь і Зімбабвэ адкрыюць разам.

**«Мы высока цэнім сяброўства з вашай краінай, з вашым народам. Нас аб'ядноўвае агульнасць падыходаў да фарміравання справядлівага светапарадку, заснаванага на суверэннай роўнасці ўсіх дзяржаў, шматбаковасці, павазе Статута ААН і міжнароднага права», — прывітаў гасцей Аляксандр Лукашэнка.**

— Наша двухбаковае супрацоўніцтва — гэта новы стандарт у рабоце з краінамі Афрыкі, — Прэзідэнт падкрэсліў, што, улічваючы такую высокую планку, беларускі бок пастараўся забяспечыць членам дэлегацыі насычаную праграму. «Я абсалютна ўпэўнены, што вынікі візіту нададуць магутны імпульс адносінам братэрства і партнёрства паміж народамі Беларусі і Зімбабвэ», — канстатаваў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што за апошнія гады нашы краіны вывелі на новы ўзровень палітычныя адносіны, значна пашырылі гандлёва-эканамічнае ўзаемадзеянне, сфарміравалі трывалую дагаворна-прававую базу супрацоўніцтва. З моманту гістарычных перагавораў прэзідэнтаў у Харарэ ў 2023 годзе зроблена многае. Створана сумесная камісія, наладжаны прамы дыялог паміж профільнымі міністэрствамі і кампаніямі, пашыраюцца гуманітарныя і культурныя кантакты паміж Беларуссю і Зімбабвэ.

**«Разам нашы краіны дасягаюць адчувальных практычных вынікаў. Сумесная праграма механізацыі сельскай гаспадаркі Зімбабвэ стала сапраўдным узорам сумленнага, адкрытага і прадукцыйнага ўзаемадзеяння», — адзначыў беларускі лідар.**

Дзякуючы гэтай праграме збор пшаніцы ў Зімбабвэ ўжо вырас больш чым у тры разы. З 2022 года Зімбабвэ цалкам забяспечвае ўнутраныя патрэбы ў пшаніцы, пачаты экспарт лішкаў у суседнія краіны, у тым ліку — Мазамбік, Батсвану і іншыя. «Мы працягваем працаваць з фокусам, каб захаваць такія ўраджаі і дадаткова ўмацаваць харчовую бяспеку Зімбабвэ і поўдня Афрыкі ў цэлым. Гэта вельмі важны напрамак — работа з вашай тэрыторыі Зімбабвэ на іншыя краіны», — падкрэсліў Прэзідэнт.

**«На гэтым прыкладзе нашай сумеснай працы іншыя краіны Афрыканскага кантынента бачаць, што эксплуатацыі і дыктату Захаду і транснацыянальных карпарацый ёсць рэальная альтэрнатыва», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.**

Сёння больш за 60 студэнтаў з Зімбабвэ ўжо навучаюцца ў беларускіх ВНУ па розных спецыяльнасцях аграрнага, медыцынскага і тэхнічнага профіляў. «Гатовыя павялічваць іх колькасць пры неабходнасці», — запэўніў беларускі лідар.

Актывізавана прамысловая кааперацыя. «Упэўнены, падпісаныя ў красавіку гэтага года пагадненні аб стварэнні ў Зімбабвэ зборачнай вытворчасці аўтобусаў будуць увасоблены ў жыццё», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Працягваецца рэалізацыя дамоўленасцяў аб узаемных пастаўках прадуктаў харчавання (сухое малако, сокі, садавіна), супрацоўніцтва ў галінах аховы здароўя і паставак лекавых сродкаў, навукі і тэхналогій. «Мы гатовыя маштабаваць назапашаны вопыт. Беларусь можа стаць надзейным партнёрам Зімбабвэ ва ўкараненні сучасных тэхналогій перапрацоўкі адходаў, лічбавізацыі, мірным выкарыстанні атамнай энергіі, узаемадзеянні ў засваенні космасу», — запэўніў Прэзідэнт. Разам з тым, заўважыў ён, ёсць пытанні, якія перашкаджаюць рухацца наперад тымі тэмпамі, якімі хацелася б, і выйсці да 2030 года на ўстойлівы ўзаемны тавараабарот, які набліжаецца да 100 мільёнаў долараў. «Трэба знайсці развязкі па гэтых пытаннях. Яны ёсць. Таму мы з вамі і вядзём гэтыя перагаворы», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік беларускай дзяржавы прапанаваў свайму калегу абмеркаваць актуальныя тэмы ўзаемнага супрацоўніцтва. «Яшчэ раз хачу падкрэсліць: мне вас няма неабходнасці пераконваць у тым, што мы людзі адказныя і гатовыя падпісаныя дамоўленасці, пагадненні выконваць дакладна і ў тэрмін. Я хачу вас запэўніць: мы заўсёды будзем верныя гэтаму прынцыпу. У гэтым вы можаце не сумнявацца. Яшчэ раз хачу падкрэсліць, што вы для нас у Беларусі заўсёды жаданы госць», — запэўніў Аляксандр Лукашэнка.

### АД ЧАГО ВЫЙГРАЮЦЬ І ЗІМБАБВЭ, І БЕЛАРУСЬ

Эмерсан Мнангагва падзякаваў за запрашэнне наведаць Беларусь. «Гасціннасць, якая была аказана мне, пераўзыходзіць усе чаканні. І мы ўдзячныя за такі прыём. Гэта сапраўды дом далёка ад дома», — прызнаўся ён.

Прэзідэнт Зімбабвэ павіншаваў Прэзідэнта Беларусі і народ з 80-й гадавінай Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Ён распавёў, што наведванне Брэсцкай крэпасці было асаблівым. «Яно нагадала нам аб тым вялікім подзвігу і ахвярах, якія ваш народ прынёс падчас вайны дзеля міру ва ўсім свеце. Мы аддаём даніну павагі воінам Беларусі, якія пакінулі свой след у гісторыі і ўнеслі вялікі ўклад у мірнае існаванне», — сказаў Эмерсан Мнангагва.

Прэзідэнт Зімбабвэ адзначыў, што прагрэс і рост у адносінах паміж нашымі краінамі прыносіць толькі задавальненне. «Мы сапраўды дасягнулі поспехаў. Аднак ёсць неабходнасць выкарыстоўваць гэтыя поспехі далей. І нацэліцца на ажыццяўленне падпісаных раней мемарандумаў аб узаемаразуменні», — заявіў ён. Эмерсан Мнангагва падкрэсліў, што беларускі бок аказаў вялікі ўплыў на механізаванне сельскай гаспадаркі і ўмацаванне харчовай бяспекі Зімбабвэ. «Гэта сапраўды велізарны крок наперад. І мы дзякуем вам за гэта і вашаму ўраду. Мы ўдзячныя за адабрэнне трэцяй фазы гэтага праекта. Трансфармацыя нашай сельскай гаспадаркі і стратэгія, якую мы выкарыстоўваем у гэтай галіне, з'яўляецца для нас прыярытэтам», — падкрэсліў прэзідэнт.

Дэлегацыя з Зімбабвэ падчас свайго візіту наведала прадпрыемства «Савушкін прадукт». Эмерсан Мнангагва падзяліўся, што ў яго засталіся станоўчыя ўражанні, і прызнаўся, што гэты візіт прымусіў шмат пра што задумацца.

«Мы гатовыя і далей разглядаць механізацыю і мадэрнізацыю нашай малочнай прамысловасці з падтрымкай нашых беларускіх партнёраў», — падкрэсліў прэзідэнт. Эмерсан Мнангагва распавёў, што Зімбабвэ імкнецца дасягнуць прагрэсу ў супрацоўніцтве ў вытворчасці тэхнікі разам з Беларуссю, бо Зімбабвэ атрымае ад гэтага велізарную карысць. І, паводле яго слоў, ад гэтага можа выйграць і беларуская эканоміка, паколькі яна будзе прысутнічаць у афрыканскім рэгіёне. «Я ўпэўнены, што гэты візіт адкрые для нас новыя дарогі і новыя магчымасці для супрацоўніцтва. Не толькі ў сельскай гаспадарцы, але і ў прамысловасці, адукацыі, сферы тэхналогій і многіх іншых галінах», — рэзюмаваў Эмерсан Мнангагва.

### ШТО ЯШЧЭ ТРЭБА ЗРАБІЦЬ ДЛЯ ЎМАЦАВАННЯ ДВУХБАКОВЫХ АДНОСІН

У заяве для СМІ Аляксандр Лукашэнка назваў перагаворы з Эмерсанам Мнангагвам насычанымі і выніковымі. У Палацы Незалежнасці лідары абмеркавалі шырокае кола пытанняў, разгледзелі, як выконваюцца ўжо дасягнутыя дамоўленасці, у тым ліку падчас беларускага візіту ў Зімбабвэ два гады таму. «Вызначылі новыя сумесныя праекты. Пры гэтым асаблівую ўвагу ўдзялілі развіццю перспектыўных напрамкаў, уключаючы міжрэгіянальнае ўзаемадзеянне і прамысловую кааперацыю, — распавёў беларускі лідар. — Мы гатовыя аказаць садзейнічанне Зімбабвэ ў стварэнні комплекснай сістэмы аховы здароўя, пастаўляць з Беларусі медыцынскія прэпараты і спецыяльнае абсталяванне, каб вырашыць праблему аказання медыцынскай дапамогі дзецям, жанчынам і ўсяму насельніцтву Зімбабвэ. Вы вывучылі нашу сістэму аховы здароўя, яна вам спадабалася. І вы гатовыя яе выбудаваць у Зімбабвэ з нашай дапамогай. Мы гатовыя вам у гэтым садзейнічаць».

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што ў аснове падпісанага па выніках перагавораў пакета двухбаковых дакументаў — Дарожная карта на 2026—2030 гады, у якой улічаны ўсе ключавыя сумесныя праекты ў розных сферах.

**«Мы дамовіліся стварыць камісію на ўзроўні кіраўнікоў дзяржаў. Яна стане стратэгічным механізмам высокага ўзроўню, які дазваляе каардынаваць работу ўжо дзеючых сумесных камісій і камітэтаў. Адпаведны праект пагаднення будзе падрыхтаваны да майго візіту ў адказ у гэтую цудоўную краіну Зімбабвэ», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.**

Сёлета Беларусь старшынствуе ў Еўразійскім эканамічным саюзе, Зімбабвэ — у Супольнасці развіцця Поўдня Афрыкі. «Мы гатовыя выкарыстоўваць сваё асаблівае становішча для актывізацыі супрацоўніцтва паміж гэтымі інтэграцыйнымі блокамі і спрашчэння ўмоў узаемнага гандлю. Вядома, у адпаведнасці з дзеючымі прававымі працэдурамі», — сказаў Прэзідэнт Беларусі.

Аляксандр Лукашэнка зрабіў акцэнт на тым, што падчас візіту Эмерсана Мнангагвы дасягнуты значныя вынікі. І заўважыў, што гэтаму папярэднічала вялікая праца ўрадаў, профільных міністэрстваў, рэгіянальных улад і кампаній. «Але я хачу выказаць шчырую ўдзячнасць менавіта вам за вялікі асабісты ўклад у развіццё стратэгічных адносін дружбы і братэрства паміж народамі Беларусі і Зімбабвэ. Перакананы, з такой падтрымкай мы яшчэ больш актыўна будзем нарошчваць тавараабарот, ствараць сумесныя перспектыўныя вытворчасці, адкрываць новыя рынкі як у Афрыцы, так і ў Еўразіі», — звярнуўся Аляксандр Лукашэнка да свайго калегі. Ён яшчэ раз падкрэсліў, што ў Беларусі заўсёды рады вітаць Эмерсана Мнангагву і яго жонку Аксілію Мнангагву і яны будуць тут як дома. «Я вельмі ўдзячны вам за ўсё, што вы зрабілі. Аддаю належнае — не было б такога ўзроўню разумення і адносін паміж Зімбабвэ і Беларуссю, калі б не вы. Гэта вы першы раз прыехалі, будучы віцэ-прэзідэнтам, у нашу краіну і прапанавалі выбудоўваць нашы адносіны. З таго ўсё і пачалося», — нагадаў кіраўнік дзяржавы.

Эмерсан Мнангагва адзначыў, што вельмі задаволены перагаворамі з беларускім калегам. Па яго словах, зімбабвійскі бок з нецярпеннем чакае працягу супрацоўніцтва з беларускімі калегамі. І акрэсліў напрамкі, у якіх яно можа развівацца.

**«У Зімбабвэ ўнікальная пазіцыя, якая дазваляе краіне стаць своеасаблівым хабам, з дапамогай якога беларускія прадукты могуць быць рэалізаваны ў больш шырокім рэгіёне. Гэта паспрыяе пашырэнню эканамічнага супрацоўніцтва з многімі краінамі Афрыкі», — адзначыў Эмерсан Мнангагва.**

Па яго словах, супрацоўніцтва з Беларуссю ўнясе вялікі ўклад у развіццё прамысловасці і эканомікі Зімбабвэ ў цэлым.

**тым часам**

# НОВЫ ЭТАП СУПРАЦОЎНІЦТВА

12 мая ў Мінску, у сценах гасцініцы «Еўропа», члены праўлення Беларускага саюза жанчын прымалі прадстаўнікоў афіцыйнай дэлегацыі Рэспублікі Зімбабвэ.

У складзе дэлегацыі Зімбабвэ — **міністр па справах жанчын, абшчын, развіцця малога і сярэдняга прадпрымальніцтва Моніка МУЦВАНГВА, міністр інфармацыі, рэкламы і радыёвяшчання Джэнфан МУСВЕРЭ**. На сустрэчы таксама прысутнічаў **Звінайра Джэйкаб КУПА, дырэктар кампаніі AVM Africa**.

Візіт зімбабвійскай дэлегацыі стаў лагічным працягам актыўнага дыялогу паміж Беларуссю і Зімбабвэ, у якім важную ролю адыгрывае Беларускі саюз жанчын. **Старшыня БСЖ Вольга ШПІЛЕЎСКАЯ** падкрэсліла, што ўзаемаадносіны паміж беларускімі і зімбабвійскімі жанчынамі маюць доўгую гісторыю і грунтуюцца на прынцыпах узаемнай павагі і імкнення да развіцця партнёрства.

— Мы актыўна супрацоўнічаем і абменьваемся дэлегацыямі, — нагадала кіраўнік БСЖ. — У мінулым годзе прадстаўнікі БСЖ наведвалі Зімбабвэ. Падчас нашага візіту быў падпісаны мемарандум аб супрацоўніцтве. І на базе гэтага дакумента выбудоўваюцца нашы адносіны. Ён ахоплівае шырокі спектр узаемадзеяння. Гэта і горназдабыўная прамысловасць, і сельская гаспадарка, і адукацыя, і медыцына, і развіццё дзелавых адносін паміж жанчынамі-прадпрымальніцамі.

Выказваючы задавальненне ў сувязі з візітам у Беларусь, міністр па справах жанчын, абшчын, развіцця малога і сярэдняга прадпрымальніцтва Рэспублікі Зімбабвэ Моніка Муцвангва адзначыла:

**— Я вельмі рада знаходзіцца тут. У нас цудоўныя, цёплыя адносіны паміж нашымі краінамі. У першую чаргу, я хацела б выказаць падзяку за тую работу, якую вы праводзіце. Мы імкнёмся, каб нашы краіны сталі партнёрамі, асабліва ў сферы малога і сярэдняга бізнесу. Бо малы і сярэдні бізнес у маёй краіне адыгрывае найважнейшую ролю і на яго прыпадае 60 % ВУП.**

У ходзе сустрэчы бакі абмеркавалі пытанні, якія ўяўляюць узаемную цікавасць. У прыватнасці, разгледжаны перспектывы пашырэння супрацоўніцтва ў галіне адукацыі, культуры, аховы здароўя, лёгкай прамысловасці і прадпрымальніцтва.

Асаблівая ўвага была аддадзена рэалізацыі сумесных праектаў, накіраваных на падтрымку жаночага бізнесу і развіццё малога і сярэдняга прадпрымальніцтва.

Таксама прадметам абмеркавання сталі пытанні, якія датычацца навучання грамадзян Зімбабвэ ў беларускіх установах адукацыі.

— Сёлета мы ўжо прымаем студэнтаў з Зімбабвэ, ствараем для іх умовы. Мы абяцалі жанчынам Зімбабвэ, што гэтыя маладыя людзі будуць адчуваць сябе як дома, — адзначыла Вольга Шпілеўская, акцэнтаваўшы ўвагу на стварэнні спрыяльнага асяроддзя для навучання і адаптацыі зімбабвійскіх студэнтаў.



У рамках абмеркавання пытанняў эканамічнага супрацоўніцтва прадстаўнікі беларускага боку выказалі гатоўнасць да пашырэння паставак прадукцыі лёгкай прамысловасці ў Зімбабвэ, а таксама да абмену вопытам і тэхналогіямі ў дадзенай сферы. **Старшыня канцэрна «Беллегпрам» Таццяна ЛУГІНА** падкрэсліла:

— Перадавалі туды спецабутак. Хачу адзначыць, што спецадзенне зарэкамендавала сябе вельмі добра. Мы перадавалі каля 50 касцюмаў, улічваючы клімат, — там ёсць перыяд дажджоў. Шэсць, сем месяцаў нашэння — нічога не вылініяла, нягледзячы на ўмовы надвор'я. Адзін з кірункаў — гэта не толькі туды пастаўляць нашу прадукцыю, але і навучаць на нашых вытворчых магутнасцях і пляцоўках.

Акрамя таго, была адзначана важнасць умацавання інфармацыйнага абмену і культурных сувязяў паміж дзвюма краінамі, што будзе спрыяць больш глыбокаму ўзаемаразуменню і збліжэнню народаў Беларусі і Зімбабвэ.

Зімбабвійскі бок адкрыты і да супрацоўніцтва ў іншых галінах. Сярод іх Эмерсан Мнангагва назваў перапрацоўку і абыходжанне з адыходамі, ачыстку вады, здабычу мінеральных рэсурсаў. Па яго словах, Беларусь і Зімбабвэ разам могуць распрацаваць сур'ёзную аснову для інвестыцый, якая забяспечыць рост прадукцыйнасці і дазволіць дзвюм эканомікам квітнець.

«Мы будзем факусіравацца на дасягненні ўзаемнага разумення па розных міжнародных пытаннях. І мы працягнем асуджаць абмежавальныя меры, санкцыі, якія прыносяць толькі шкоду і перашкаджаюць рэалізацыі Мэт устойлівага развіцця. Таму мы яшчэ раз пацвярджаем нашы абавязацельствы падтрымліваць адмену санкцый, якія былі ўведзены супраць нашых дзяржаў», — заявіў Прэзідэнт Зімбабвэ.

## ЯКІЯ ДАКУМЕНТЫ БУДУЦЬ РЭГУЛЯВАЦЬ ДВУХБАКОВАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА

Для ўмацавання адносін Беларусі і Зімбабвэ і дасягнення больш высокіх вынікаў быў падпісаны пакет дакументаў. Урачыстая цырымонія абмену тэкстамі міжнародных дакументаў прайшла пасля перагавораў на вышэйшым узроўні. Ключавы дакумент — Дарожная карта стратэгічнага супрацоўніцтва і партнёрства на 2026—2030 гады. Урады дзвюх краін падпісалі Пагадненне аб адмене віз для ўладальнікаў дыпламатычных і службовых пашпартоў. Пагадненні аб супрацоўніцтве ў галіне папярэджання і ліквідацыі стыхійных бедстваў і тэхнагенных аварый падпісалі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Беларусі і Міністэрства мясцовага самакіравання і грамадскіх работ Зімбабвэ. Таксама падпісаны мемарандумы аб узаемаедзенні ў сферах турызму, развіцці малых і сярэдніх прадпрыемстваў, сродках масавай інфармацыі. Бакі падпісалі Мемарандум аб узаемаразуменні ў галіне кіравання адходамі і ачысткі вады. У пакеце падпісаных дакументаў таксама — Мемарандум аб намерах адносна рэканструкцыі бальніцы ў горадзе Харарэ і Мемарандум аб намерах адносна ўзмацнення партнёрства ў ахове здароўя.

**Валерыя СЦЯЦКО.**



Фота БелТА.

**У тэму**

### ІНВЕСТЫЦЫІ, СЕЛЬСКАЯ ГАСПАДАРКА, ПРАМЫСЛОВАСЦЬ — ЧЫМ БУДЗЕ НАСЫЧАНА СУПРАЦОЎНІЦТВА БЕЛАРУСІ І ЗІМБАБВЭ

Мэты Беларусі і Зімбабвэ абсалютна канкрэтныя і цалкам дасягальныя. Тым больш што для іх дасягнення ўсё ёсць: агульныя пазіцыі краін па шэрагу пытанняў, узаемаразуменне паміж кіраўніцтвам і дакладнае разуменне, што трэба рабіць. Гэта даказалі і перагаворы прэзідэнтаў Аляксандра Лукашэнкі і Эмерсана Мнангагвы ў Палацы Незалежнасці. Даведаліся ў профільных міністраў, як будуць развівацца двухбаковыя адносіны Беларусі і Зімбабвэ.



**Міністр эканомікі Юрый ЧАБАТАР** расказаў, што беларускі бок па лініі Міністэрства эканомікі праводзіць мэтанакіраваную палітыку па пытаннях прыцягнення інвестыцый і прадпрымальніцтва. Беларускі бок падзяліўся з калегамі сваім досведам падтрымкі прадпрымальніцтва, падтрымкі экспарту. Юрый Чабатар расказаў, што зімбабвійскіх калег асабліва зацікавілі пытанні ўнутранай кааперацыі паміж малымі і вялікімі прадпрыемствамі. «У 2023 годзе мы падпісалі Пагадненне аб абароне інвестыцый. З нашага боку гэта пагадненне ратыфікавана. Чакаем ратыфікацыі ад нашых калег. І гэта добрая кропка ўваходу ў пытанні абароны інвестыцый, стварэнні сумесных прадпрыемстваў як у Зімбабвэ, так і ў нас у Беларусі», — расказаў міністр.



**Міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Юрый ГОРЛАЎ** падкрэсліў, што Беларусь працягвае пастаўляць у Зімбабвэ сухое абястлушчанае малако, таксама ў іх ёсць цікавасць да паставак з нашай краіны сухога дзіцячага харчавання. Гэта ўжо традыцыйныя кірункі, беларускі бок адкрыты і да новых праектаў. «Мы прапанавалі партнёрам шэраг праектаў у жывёлагадоўчай галіне і птушкагадоўлі, па будаўніцтве зернесушыльных комплексаў. Зімбабвійскі бок зацікаўлены ў тым, каб пабудаваць збожжасховішчы, таму мы ў гэтым кірунку таксама з імі супрацоўнічаем. Пастараемся прыйсці да нейкага кансэнсусу. У нас ёсць кампаніі, якія гатовыя выехаць туды, спраектаваць і пабудаваць цалкам пад ключ гэтыя аб'екты», — распавёў міністр сельскай гаспадаркі і харчавання.



**Міністр прамысловасці Аляксандр ЯФІМАЎ** праінфармаваў аб планах да 2027 года арганізаваць вытворчасць трактарнай тэхнікі на тэрыторыі Зімбабвэ. Цяпер гэтыя праекты знаходзяцца ў стадыі рэалізацыі. Таксама ў планах — арганізаваць сумесную вытворчасць пасажырскай і грузавой тэхнікі. Міністр падкрэсліў, што гэтая прадукцыя ў перспектыве можа пастаўляцца і на рынкі суседніх з Зімбабвэ краін. «Перавага супрацоўніцтва, якое мы прапануем нашым партнёрам, заключаецца ў тым, што мы навучаем спецыялістаў і абслугоўванню тэхнікі, калі гэта продаж гатовых вырабаў, і зборачным аперацыям, іншым тэхналагічным працэсам. Нашы спецыялісты гатовыя да доўгіх выездаў для якаснай перадачы кампетэнцый нашым партнёрам», — адзначыў ён. Супрацоўніцтва з Зімбабвэ па лініі прамысловасці Аляксандр Яфімаў назваў стратэгічным: «Зімбабвэ па дыверсіфікацыі экспарту і развіцці экспартных паставак вызначана як адна з ключавых краін на афрыканскім кантыненце. У нас там даволі шмат планаў, і мы іх рэалізоўваем досыць паспяхова».

— Не менш важная сустрэча з міністрам інфармацыі, рэкламы і радыёвяшчання. Чым больш краіны будуць ведаць адна пра адну, разумець культуру адна адной, тым больш мы будзем разумець, як развіваюцца нашы краіны, тым больш цеснымі будуць нашы ўзаемаадносіны. Не толькі эканамічныя, але і культурныя, і сацыяльныя. А пунктаў судакранання ў нас вельмі шмат, — перакананы кіраўнік БСЖ. — Жанчын усяго свету звязваюць заўсёды такія, мне здаецца, вельмі аднолькавыя каштоўнасці. Гэта сям'я, дзеці, здароўе, развіццё дзяцей і здароўе нацыі ў прынцыпе.

Візіт дэлегацыі Рэспублікі Зімбабвэ ў Беларусь стаў важным крокам у развіцці міждзяржаўных адносін і стварэнні трывалай асновы для доўгатэрміновага і ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва ў розных сферах. Вынікі праведзеных перагавораў сведчаць аб імкненні абодвух бакоў да далейшага паглыблення партнёрства і рэалізацыі сумесных праектаў, накіраваных на дабрабыт народаў Беларусі і Зімбабвэ.

## АЙЧЫННЫ МЕДЫЯДОСВЕД НА ЭКСПАРТ

Беларусь працягвае супрацоўніцтва з Рэспублікай Зімбабвэ ў розных сферах, у тым ліку ў медыяпрасторы.

13 мая ў Белтэлерадыёкампаніі пабываў **міністр інфармацыі, рэкламы і радыёвяшчання Рэспублікі Зімбабвэ Джэнфан МУСВЕРЭ**.

Дэлегацыя з афрыканскай рэспублікі прыбыла з мэтай вывучыць структуру і ўнутраную работу вядучых беларускіх медыяхолдынгаў, а таксама абмеркаваць перспектыўныя кірункі супрацоўніцтва. Асноўны акцэнт у перагаворах быў зроблены на распрацоўцы сумесных ініцыятыў, накіраваных на ўмацаванне двухбаковага партнёрства ў сферы СМІ. Абодва бакі падкрэслілі станоўчую дынаміку развіцця адносін паміж дзвюма краінамі.

Па словах **старшыні Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Рэспублікі Беларусь Івана ЭЙСМАНТА**, Зімбабвэ бачыць у Беларусі прыклад паспяховага супрацьстаяння знешняму націску ў інфармацыйнай прасторы.

Цікавасць да беларускай інфармацыйнай стратэгіі і гатоўнасць да абмену кантэнтам адкрываюць новыя магчымасці для развіцця культурных і інфармацыйных сувязяў паміж дзвюма краінамі. Эксперты мяркуюць, што гэта толькі першы крок на шляху да доўгатэрміновага і плённага супрацоўніцтва ў сферы медыя.

**Марыя АСМАЛОЎСКАЯ.**
**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**

АКТУАЛЬНА

# ПАДСТАВІЦЬ ПЛЯЧО АГРАРЫЯМ

### Сельгасарганізацыі павінны да 1 чэрвеня максімальна знізіць наступствы вясновых замаразкаў

Бягучы стан пасеваў, перспектывы ўраджаю-2025 і меры па пераадоленні наступстваў вясновых замаразкаў абмеркавалі ўчора на нарадзе ў Прэм'ер-міністра Аляксандра ТУРЧЫНА, паведамілі ў прэс-службе ўрада.

Як падкрэсліў Аляксандр Турчын, для павышэння ўраджайнасці і зніжэння наступстваў замаразкаў збожжавая група павінна быць кампенсавана за кошт перасеву пашкоджаных плошчаў аднагадовымі травамі і кукурузай на зерне.

Пагодна-кліматычныя ўмовы бягучага года дазволілі сельскагаспадарчым арганізацыям прыступіць да вясновых палявых работ у сакавіку, што практычна на месяц раней за існуючыя тэрміны. Аднак цёплае надвор'е чаргавалася з рэзкім пахаладаннем і працяглымі замаразкамі з канца красавіка па першы тыдзень мая, што адбілася на развіцці сельскагаспадарчых культур ва ўсіх рэгіёнах краіны. Найбольш пацярпелі пасевы азімых культур. Пашкоджаныя пасевы адназначна патрабуюць дадатковых мер догляду, а тыя, якія не ўдалося выратаваць, — перасявання.

— Усе работы павінны быць завершаны да 1 чэрвеня. Таксама акцэнтую ўвагу, што безгаспадарчасць не ўдасца спісаць на ўмовы надвор'я, — падкрэсліў Прэм'ер-міністр.

ПАРЛАМЕНЦКІ ДЗЁННІК

# НАЦЫЯНАЛЬНАЯ БЯСПЕКА, МІЖНАРОДНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ І НАДЗЕЙНАЯ ПАШТОВАЯ СУВЯЗЬ

### Дэпутаты прынялі шэраг законапраектаў

Адкрываючы чарговае пасяджэнне, Старшыня Палаты прадстаўнікоў Ігар СЕРГЯЕНКА адзначыў, што яно праходзіць у знакавы дзень. «Роўна 30 гадоў таму — 14 мая 1995 года — адбыўся першы ў суверэннай гісторыі нашай краіны рэферэндум, — нагадаў спікер. — Ён не толькі вызначыў шэраг канцэптуальных напрамкаў унутранай і знешняй палітыкі, але і стаў першым крокам пабудовы дзяржавы сапраўднага народаўладдзя, у якім народ прымае рашэнні па найважнейшых пытаннях жыцця краіны і грамадства. Менавіта на гэтым рэферэндуме былі ўстаноўлены дзяржаўныя сімвалы незалежнай Беларусі, вызначаны канстытуцыйны статус рускай мовы і выказана безумоўная падтрымка дзеянняў кіраўніка дзяржавы па эканамічнай інтэграцыі з Расійскай Федэрацыяй».

## ДОСТУП ДА ДЗЯРЖСАКРЭТАЎ І БЯСПЕЧНЫЯ АДПРАЎЛЕННІ

Законапраектам «Аб змяненні Закона Рэспублікі Беларусь «Аб дзяржаўных сакрэтах», прынятым адразу ў двух чытаннях, прапаноўваецца даць допуск да дзяржаўных сакрэтаў Старшыні і членам Прэзідыума Усебеларускага народнага сходу, старшыні Цэнтральнай выбарчай камісіі з дня выбрання іх на гэтыя пасады, начальніку Сакратарыята Усебеларускага народнага сходу — з дня прызначэння на пасаду.

«На Усебеларускі народны сход ускладзены задачы стратэгічнага развіцця нашай краіны, вырашэнне пытанняў практычна ва ўсіх сферах жыццядзейнасці дзяржавы, — канстатаваў **член Пастаяннай камісіі па нацыянальнай бяспецы Палаты прадстаўнікоў Міхаіл АКСЯНЮК**. — Безумоўна, некаторая інфармацыя аднесена да дзяржаўных сакрэтаў. Каб павысіць эфектыўнасць работы службовых асоб і Усебеларускага народнага сходу, гэтым законам будзе прадугледжана магчымасць давання вышэйназваным службовым асобам допуску да дзяржаўных сакрэтаў».

У другім чытанні адобраны праект Закона Рэспублікі Беларусь «Аб змяненні Закона Рэспублікі Беларусь «Аб паштовай сувязі», якім змяняюцца прававое рэгуляванне і арганізацыйныя асновы ў сферы паштовай дзейнасці. Дакумент падрыхтаваны з мэтай выяўлення прадметаў і рэчываў, забароненых да перасылкі ў паштовых адпраўленнях. Замацоўваюцца паўнамоцтвы Прэзідэнта на ўстанаўленне асаблівасцяў прававога рэгулявання адносін у галіне паштовай сувязі. Урад надзяляецца паўнамоцтвамі на вызначэнне парадку функцыянавання сістэмы ўліку і захоўвання даных, уключаючы пералік і тэрміны захоўвання інфармацыі аб паштовых адпраўленнях, што рэгіструюцца, падлягаюць уліку і захоўванню ў гэтай сістэме.

Па словах **намесніка старшыні Пастаяннай камісіі па прамысловасці, энергетыцы, транспарце, сувязі і лічбавым развіцці Палаты прадстаўнікоў Уладзіміра БАРАВЕНКІ**, законапраектам павышаецца бяспека паштовых адпраўленняў. «Прадугледжваецца стварэнне адзінай аўтаматызаванай сістэмы ўліку і захоўвання даных аб перамяшчэннях паштовых адпраўленняў, да якой будуць падключацца ўсе аператары паштовай сувязі, — канкрэтызаваў дэпутат. — З'явіцца магчымасць падключэння да сістэмы органаў, якія ажыццяўляюць аператыўна-вышуковую дзейнасць. Таксама вырашаецца блок пытанняў аб павышэнні эфектыўнасці работы паштовай сувязі, аб чым казаў кіраўнік дзяржавы пры прызначэнні ўрада. Законам рэгулюецца пытанне аб прымяненні інфармацыйных і іншых прагрэсіўных тэхналогій, у тым ліку лічбавых сэрвісаў і мабільных дадаткаў».

## УМАЦАВАННЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА

Дэпутаты ратыфікавалі Пагадненне паміж Рэспублікай Беларусь і Расійскай Федэрацыяй аб парадку ўзаемнага выканання судовых пастаноў судоў Рэспублікі Беларусь і судоў Расійскай Федэрацыі. Пагадненне будзе прымяняцца да судовых пастаноў, вынесеных па грамадзянскіх справах і крымінальных справах у частцы грамадзянскага іску, якія прадугледжваюць абавязацельствы даўжніка па выплаце на карысць спагнанніка грашовых сродкаў, у тым ліку ў частцы спагнання дзяржаўнай пошліны, іншых судовых расходаў і працэсуальных выдаткаў. Вызначана, што судовыя пастановы, вынесеныя кампетэнтнымі судамі аднаго боку, не маюць патрэбы ў спецыяльнай працэдуры прызнання



і выконваюцца на тэрыторыі іншага боку ў такім жа парадку, што і судовыя пастановы, вынесеныя на тэрыторыі іншага боку, на падставе выканаўчых дакументаў кампетэнтных судоў боку, на тэрыторыі якога былі вынесены судовыя пастановы.

**Член Пастаяннай камісіі па заканадаўстве Палаты прадстаўнікоў Андрэй АНІСІМАЎ** назваў гэты дакумент важнай вяхой у двухбаковых узаемаадносінах. «Пагадненнем значна спрашчаецца парадак прызнання і выканання актаў кампетэнтных судоў Расійскай Федэрацыі і Рэспублікі Беларусь, — канкрэтызаваў ён. — Выключаецца раней неабходнае прызнанне такіх пастаноў, што ў значнай меры ўмацоўвае правы і абавязкі спагнанніка як з боку Беларусі, так і Расіі. Раней для выканання падобных пастаноў судоў неабходна было прызнанне бокам, дзе знаходзіцца адказчык альбо спагнаннік, такой пастановы. Цяпер гэтага няма, што значна скароціць працэдуру выканання і спросціць работу кампетэнтных органаў».

Таксама ратыфікаваны Дагавор паміж Рэспублікай Беларусь і Ісламскай Рэспублікай Пакістан аб выдачы, Пратакол аб унясенні змяненняў у Дагавор аб Еўразійскім эканамічным саюзе ад 29 мая 2014 года ў частцы, якая датычыцца асаблівага механізму пры правядзенні расследаванняў аб прыняцці рашэнняў аб прымяненні або непрымяненні спецыяльных абарончых, антыдэмпінгавых і кампенсацыйных мер.

Ратыфікацыя Пагаднення паміж урадам Рэспублікі Беларусь і ўрадам Рэспублікі Сейшэльскія Астравы аб паветраных зносінах накіравана на рэгуляванне аператыўных і тэхнічных аспектаў у галіне паветранага транспарту і з'яўляецца прававой асновай для арганізацыі паветраных перавозак. У далейшым гэта дазволіць авіяперавозчыкам выконваць пасажырскія і грузавыя рэйсы паміж аэрапортамі дзвюх краін.

«Гэта яшчэ адзін крок, які робіцца ў кантэксце рэалізацыі сістэмы і структуры міжнародных адносін, якія выпрацаваны кіраўніком дзяржавы ў рамках наладжвання кантактаў з краінамі далёкай дугі, — адзначыў **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па прамысловасці, энергетыцы, транспарце, сувязі і лічбавым развіцці Палаты прадстаўнікоў Віталій УТКІН**. — Рэспубліка Беларусь дакладна ўпісваецца ў архітэктуру авіяперавозак міжнароднага кантакту. Насуперак інфармацыі аб ізаляцыі нашай краіны ад усяго свету, якой закідвае заходняя прапагандысцкая машына, мы дэманструем, што сёння Беларусь працуе, працягвае ўзаемаадносіны як палітычнага, так і эканамічнага плана з тымі дзяржавамі, якія сёння не прапагандуюць ваенныя дзеянні. Таму развіццё мірнай галіны турызму ўзаемаадносін паміж нашымі краінамі сведчаць аб тым, як неабходна ўзаемадзейнічаць у эканамічных, палітычных, сяброўскіх і культурных адносінах».

Акрамя таго, ратыфікавана Пагадненне паміж урадам Рэспублікі Беларусь і ўрадам Каралеўства Саудаўская Аравія аб паветраных зносінах, у адным чытанні прыняты законапраект «Аб спыненні дзеяння Пагаднення паміж урадам Рэспублікі Беларусь і Кабінетам міністраў Украіны аб вытворчай і навукова-тэхнічнай кааперацыі».

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота БелТА.**

ГРАМАДСТВА

# БЕЛАРУСЬ АРГАНІЗУЕ АДПАЧЫНАК І АЗДАРАЎЛЕННЕ ДЛЯ 314 ДЗЯЦЕЙ З 10 КРАІН

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка напярэдадні аздараўленчай кампаніі падпісаў распараджэнне аб выдзяленні грашовых сродкаў для арганізацыі адпачынку 314 дзяцей з Алжыра, Егіпта, Індыі, Кітая, Лаоса, М'янмы, Палесціны, Кыргызстана, Узбекістана і Курскай вобласці Расіі ў Нацыянальным дзіцячым адукацыйна-аздараўленчым цэнтры «Зубраня». Аб гэтым паведамілі ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы.



У час знаходжання ў Беларусі дзеці пройдуць медыцынскае абследаванне, атрымаюць неабходнае санаторна-курортнае лячэнне, наведаюць культурныя мерапрыемствы і знакавыя гістарычныя аб'екты ў Мінску і рэгіёнах.

Дзяцей з іншых дзяржаў запрашаюць на адпачынак і аздараўленне ў Беларусь штогод з 2017 года. За час дзеяння праграмы аздараўленчага турызму ў нашай краіне адпачылі і атрымалі лячэнне больш за 2,5 тыс. дзяцей з-за мяжы. Гэта садзейнічае ўмацаванню даверу і ўзаемаразумення ў адносінах з дружалюбнымі краінамі, а таксама развіццю супрацоўніцтва ў гуманітарна-адукацыйнай сферы.

ПА СУТНАСЦІ

# ПРАГА ДА ЖЫЦЦЯ



Дрэнна чалавеку быць аднаму. У простых словах — абсалютная ісціна. Сям'я — гэта аснова сацыялізацыі. І чым больш дзяцей за адным сталом, тым больш яны адаптаваныя да грамадскага жыцця. Шматдзетныя сям'і — найлепшыя лекі ад «вірусаў» сучаснасці: інфантылізму і эгацэнтрызму, абыякавасці да жыцця.

Айфоны апошняга пакалення, паўднёвакарэйская касметыка і французскія сукенкі не прыносяць шчасце, насамрэч радасць — у вялікай і дружнай сям'і. Брытанскія эксперты, якія ўжо перайшлі ў разрад мэмаў, падлічылі, што... кацiныя прыбіральні таннейшыя за дзіцячыя падгузкі. Разумееце, да чаго вядуць? Гэта пра адносіны да сям'і і да працягу свайго роду. А чаму чалавек так імкнецца да заморскага адпачынку, чаму сучасны «зумер» жыве ў «метасусвеце»? Найперш ад адзіноты, дэфіцыту сямейных зносін. Ніводны псіхолаг не заменіць роднага чалавека, якому душу можна раскрыць нібы бусел крылы. Не ўражанні ад падарожжаў па свеце, не стосы каштоўных папер, самая галоўная інвестыцыя — нашы дзеці.

А яшчэ ёсць геапалітычны і сакральны сэнсы. Зноў пашыраюцца ідэі нацызму, постнацызму. Калі не ў гета і канцлагерах знішчаюць, «рэгулююць» чалавецтва, а праз сэнсы. «Звышідэя» тая ж — «зачышчаць» жыццёвую прастору, прыкрываючыся «высокай філасофіяй». Ад вострава Эпштэйна праз Давос самы кароткі шлях у «сучасны канцлагер». Лічбавы і канцэптуальны. Чалавека-творцу ператварылі ў спажыўца, мужчынскі і жаночы свет — у гендарную распусту, жанчыну-прыгажуню — у радыкальную «фэмэн» са зламанай псіхікай, а чайлдфры — у глабальную моду. Нават спрабуюць раіць, як выхоўваць дзяцей: замест бацькоўскага слова — ювенальная юстыцыя.

Цягам тысячагоддзяў чалавечы геній пабудаваў піраміды, адкрыў новыя кантыненты, дабраўся да космасу. А цяпер што, «назад у пячоры»? І напрамак галоўнага ўдару — сям'я. Бо без сям'і няма грамадства, краіны, будучыні. Замест шчаслівага, паўнаважкага жыцця — лічба. Ці не ў гэтым той самы жудасны апакаліпсіс — зруйнаваць сям'ю?

Вось ён, новы свет — цывілізацыя «калектыўнага Захаду». Але мы, як Брэсцкая крэпасць, — трымаемся. Сям'я ж гэта яшчэ і бескампрамісны тэст для грамадства. Памятаеце, як у пасляваенны час людзі стваралі шматдзетныя сем'і. Нават нягледзячы на суцэльнае папялішча. А ў постсавецкі перыяд шматдзетнасць аказалася не «ў трэндзе». Цяпер у шырокім сэнсе час вясны — росквіту для дэмаграфіі. Гэта наш непахісны дзяржаўны курс.

Вельмі сімвалічна, што па суседстве з Палацам Незалежнасці — РНПЦ «Маці і дзіця». Непадалёк будуюць Музей дзяржаўнасці. Вось яна —сакральная архітэктура нашай незалежнасці. Наша дэмаграфічная палітыка насуперак заходняй канцэпцыі знішчэння. Гэта пераможная прага да жыцця. Каб і надалей за сямейнай бяседай збіраліся сем'і, каб з дзіцячымі каляскамі па ўтульных парках гулялі матулі-шчабятухі, а гарэзлівыя дзеці сваімі ручкамі абдымалі суровыя шчаціністыя, але шчаслівыя твары татаў — бацька зробіць усё.

**Яўген ПУСТАВОЙ.**

# У ЦЭНТРЫ ЎВАГІ ДЗЯРЖАВЫ...



## КОЖНАЕ ПЯТАЕ ДЗІЦЯ — СА ШМАТДЗЕТНАЙ СЯМ'І

Сям'я заўсёды была сярод жыццёвых прыярытэтаў беларусаў. Паводле сацыялагічнага даследавання, праведзенага Цэнтрам сацыялагічных і палітычных даследаванняў БДУ ў 2023 годзе, у беларусаў сфарміравана ўстойлівая сацыяльная норма адносна жаданай колькасці дзяцей — два дзіцяці ў сям'і. Аднак, як адзначыла **намеснік начальніка ўпраўлення народанасельніцтва, гендарнай і сямейнай палітыкі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Святлана КОВАЛЬ,** больш за трэць суайчыннікаў не рэалізуюць свае жаданні ў поўнай меры, спыняючыся на адным дзіцяці.

Галоўная прычына — павелічэнне ўзросту ўступлення ў шлюб і нараджэння дзяцей. Як сведчыць статыстыка, летась сярэдні ўзрост нявест, якія ўступалі ў першы шлюб, склаў 26,7 года, жаніхоў — 28,9, узрост маці пры нараджэнні першага дзіцяці — 27,6 года. Яшчэ адна прычына, якая ўплывае на нараджальнасць, — няўстойлівасць шлюбаў. Паказчык колькасці разводаў стабільна трымаецца на ўзроўні 3,4—3,7 выпадку на тысячу насельніцтва. Пры гэтым больш за палова з іх адбываецца ў сем'ях, дзе ёсць непаўналетнія дзеці.

**МАЮЦЬ ДЗЯЦЕЙ ВА ЎЗРОСЦЕ ДА 18 ГАДОЎ**




Большасць беларускіх сем'яў выхоўвае адно дзіця. Па даных перапісу 2019 года, 57,3 % сем'яў маюць адно дзіця, 33,5 % — дваіх і толькі 9,2 % — траіх і болей. У краіне 122 тысячы шматдзетных сем'яў, у якіх выхоўваецца 400 тысяч дзяцей. Кожнае пятае дзіця ў Беларусі — менавіта з такой сям'і. Пры гэтым 80 % шматдзетных — сем'і з трыма дзецьмі і 20 % маюць чатырох і больш дзяцей.

## 3,7 МІЛЬЯРДА РУБЛЁЎ — НА ВЫПЛАТУ ДАПАМОГ

Сацыяльная абарона сем'яў забяспечваецца праз дапамогі пры нараджэнні і падчас выхавання дзяцей, сямейны капітал, адрасную сацыяльную дапамогу і сацыяльныя паслугі, гарантыі ў сферы працы, пенсіённае забеспячэнне, жыллёва-крэдытныя адносіны. Сёлета на выплату дзяржаўных дапамог сем'ям выдаткавана 3,7 мільярда рублёў, з іх амаль 2 мільярды — на выплату дапамог на дзяцей ва ўзросце да трох гадоў. Выплатамі ахоплена амаль 348 тысяч дзяцей, з іх 186 тысяч — дзеці да трох гадоў. Памер аднаразовай дапамогі ў сувязі з нараджэннем дзіцяці складае 10 БПМ, з 1 мая — гэта 4600 рублёў, а пры нараджэнні другога і наступнага дзяцей — 14 БМП, або 6,5 тысячы рублёў.

Памер дапамогі па доглядзе дзіцяці да трох гадоў складае 860 рублёў, другога і наступных — 984 рублі, дзіцяці-інваліда — 1107 рублёў. Пры выхаванні дваіх дзяцей, адзін з якіх ва ўзросце да трох гадоў, на працягу трох гадоў выплачваецца дзве дапамогі, якія сумарна складаюць больш за 1200 рублёў. Пры нараджэнні двайнят і трайнят сям'я атрымлівае дадатковую дапамогу на набыццё рэчаў першай неабходнасці, і сёння гэта 925 рублёў на кожнае дзіця.

**Сямейны капітал пры нараджэнні ці ўсынаўленні трэцяга і наступных дзяцей складае 33 275 рублёў. Сёлета на яго выплаты ў бюджэце прадугледжана больш за 360 мільёнаў рублёў. У «Беларусбанку» за ўвесь перыяд рэалізацыі праграмы адкрыта 146 тысяч укладаў «Сямейны капітал», на якія было залічана 826 мільёнаў долараў і 1 мільярд 659 мільёнаў рублёў.**

Шматдзетныя сем'і маюць права датэрмінова выкарыстаць гэтыя сродкі на будаўніцтва, рэканструкцыю, набыццё жылля, пагашэнне крэдытаў і пазык, выдадзеных на такія мэты, атрыманне адукацыі і медыцынскіх паслуг. На цяперашні час прынята больш за 92 тысячы рашэнняў аб датэрміновым выкарыстанні сямейнага капіталу.

**ДОЛЯ ЎСТУПІЎШЫХ У ШЛЮБ**

(у працэнтах)




## ЖЫЛЛЁ З ДЗЯРЖПАДТРЫМКАЙ

Яшчэ адзін кірунак дзяржаўнай падтрымкі — адрасная сацыяльная дапамога. Летась бясплатнымі прадуктамі харчавання забяспечылі амаль 9 тысяч дзяцей ва ўзросце да двух гадоў. Сярэдні памер такой дапамогі ў 2024-м склаў 220 рублёў у месяц. Сёлета ў першым квартале харчаваннем забяспечана каля 5 тысяч дзяцей. Пры нараджэнні двайнят і трайнят такое харчаванне даецца без уліку даходаў сям'і. У мінулым годзе ім забяспечана больш за 4 тысячы дзяцей.

Штомесячную і аднаразовую сацыяльную дапамогу на набыццё прадуктаў харчавання, лекавых сродкаў, адзення і абутку, школьных прылад летась атрымалі амаль 62 тысячы чалавек з ліку сем'яў з дзецьмі, у бягучым годзе — ужо каля 13 тысяч. Штомесячную сацыяльную дапамогу ў 2024-м атрымалі каля 46 тысяч чалавек з катэгорыі шматдзетных сем'яў, сёлета ў першым квартале — каля 9,5 тысячы. На аказанне адраснай сацыяльнай дапамогі ў гэтым годзе выдаткавана 145 мільёнаў рублёў.

Сярод іншых відаў падтрымкі сем'яў — працоўныя і пенсіённыя гарантыі, а таксама дапамога ў вырашэнні жыллёвага пытання. Што датычыцца апошняга, то льготны крэдыт выдаецца маладой сям'і з двума дзецьмі пад 5 % гадавых на 20 гадоў, шматдзетнай сям'і — пад 1 % гадавых на 40 гадоў. Пры гэтым дзяржава аказвае дапамогу пры пагашэнні запазычанасці па льготных крэдытах. Маладым сем'ям пры нараджэнні першага дзіцяці фінансавая дапамога прадастаўляецца ў памеры 10 % ад сумы запазычанасці па льготным крэдыце і ў памеры 20 % — пры нараджэнні другога дзіцяці. Для сем'яў з трыма дзецьмі дзяржава пагашае 75 % ад сумы запазычанасці, з чатырма і больш дзецьмі сума запазычанасці цалкам пагашаецца дзяржавай. Летась 5,6 тысячы маладых сем'яў і 7,8 тысяч шматдзетных змаглі палепшыць свае жыллёвыя ўмовы пры дзяржаўнай падтрымцы.

**СЯРЭДНІ ЎЗРОСТ УСТУПЛЕННЯ Ў ПЕРШЫ ШЛЮБ У 2024 ГОДЗЕ**

(гадоў)




**У 2024 годзе ўпершыню ўступілі ў шлюб 28 146 жанчын і 29 776 мужчын**

## ПА ПОКЛІЧЫ СЭРЦА

**Падтрымку сем'ям аказваюць і грамадскія арганізацыі, у прыватнасці Беларускі саюз жанчын. Пад яго эгідай праводзіцца шэраг ініцыятыў, сярод якіх — рэспубліканскі конкурс «Сям'я года», фестываль «Разам» і іншыя.**

— Пад нашым патранажам знаходзяцца сем'і, якія маюць патрэбу ў падтрымцы. У Мінску ёсць шматдзетная сям'я, дзе бацька адзін выхоўвае дачок. Ён выдатна спраўляецца са сваімі абавязкамі, але з падтрымкай БСЖ гэта рабіць прасцей, — расказала **намеснік старшыні грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз жанчын», намеснік дырэктара па медыцынскай экспертызе і сацыяльнай рэабілітацыі РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава Іна САЛДАЦЕНКА.** — Дапамагалі і сям'і з Гомельскай вобласці, дзе адна мама выхоўвала дзіця і трапіла ў складаную сітуацыю — цяжка захварэла і была шпіталізавана ў Мінск на чатыры месяцы. Мы хутка знайшлі патранажную сям'ю, якая забрала да сябе дзіця на гэты час, і падтрымлівалі жанчыну, наведвалі яе ў бальніцы. Так мы дапамагаем па покліччы сэрца.

Як адзначыла **старшыня грамадскага аб'яднання «Беларуская асацыяцыя шматдзетных бацькоў» Таццяна КРАЎЧАНКА,** у 1990-х у нашай краіне была нізкая нараджальнасць. У Мінску налічвалася менш за 2 тысячы шматдзетных сем'яў і каля 56 тысяч — ва ўсёй Беларусі. Цяпер гэта адпаведна каля 18 тысяч і 123 тысяч. Сітуацыю ўдалося змяніць з пачатку 2000-х, калі Прэзідэнт падпісаў указ аб будаўніцтве льготнага жылля для шматдзетных сем'яў. Гэта стала першай мерай, дзякуючы якой беларусы пачалі вяртацца да традыцыйных устояў, калі сем'і былі вялікімі.

**Алена КРАВЕЦ.**

**Крыніца інфаграфікі Нацыянальны статыстычны камітэт Рэспублікі Беларусь**




(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)



НЕФАРМАТ

# І ...СЯМЕЙНЫЯ КАШТОЎНАСЦІ

Тыдні два таму ішла па вуліцы ў Кобрыне і напоўніцу ўдыхала чароўны водар квітнеючага бэзу. Вось такой жа прыгожай парой дваццаць сем гадоў таму ехала ў Кобрын, каб пазнаёміцца з сям'ёй Селехаў, у якіх нарадзіліся дзеці.



Маці з дочкамі ў хатнім музеі.

Таким образом, нами была определена существенность и проведена оценка рисков существенного искажения финансовой отчетности. В частности, мы проанализировали, в каких областях руководство выносило субъективные суждения, например, в отношении значимых оценочных значений, что включало применение допущений и рассмотрение будущих событий, с которыми в силу их характера связана неопределенность. Мы также рассмотрели риск обхода системы внутреннего контроля руководством, включая, помимо прочего, оценку наличия признаков необъективности руководства, которая создает риск существенного искажения вследствие недобросовестных действий.

**Ключевые вопросы аудита**

Ключевые вопросы аудита – это вопросы, которые, согласно нашему профессиональному суждению, являлись наиболее значимыми для проводимого аудита финансовой отчетности. Эти вопросы были рассмотрены в контексте нашего аудита финансовой отчетности в целом, а также при формировании нашего мнения об этой отчетности, и мы не выражаем отдельного мнения по этим вопросам.

| Ключевой вопрос аудита | Какие аудиторские процедуры были выполнены в отношении ключевого вопроса аудита |
|---|---|
| **Оценочный резерв под ожидаемые кредитные убытки по кредитам и авансам, предоставленным корпоративным клиентам в соответствии с МСФО (IFRS) 9 «Финансовые инструменты»** | |
| В связи со значимостью кредитов и авансов, предоставленных корпоративным клиентам, и важностью суждений и оценок, используемых для расчета соответствующих резервов, расчет оценочного резерва под ожидаемые кредитные убытки (далее – «ОКУ») по кредитам и авансам, предоставленным корпоративным клиентам, считается ключевым вопросом аудита.<br>Величина оценочного резерва под ОКУ представляет собой наилучшую оценку руководством ожидаемых кредитных потерь по кредитам и авансам, предоставленным корпоративным клиентам, по состоянию на отчетную дату.<br>Оценочный резерв под ОКУ создается Банком на индивидуальной и коллективной основе.<br>Расчет оценочного резерва под ОКУ на индивидуальной основе осуществляется Банком по задолженности существенно значимых заемщиков – корпоративных клиентов, общая сумма задолженности которых является существенной.<br>Для расчета оценочного резерва под ОКУ на индивидуальной основе Банк применяет профессиональное суждение, чтобы оценить ожидаемые денежные потоки по кредитам и авансам, предоставленным корпоративным клиентам, а также риск или вероятность возникновения кредитных потерь, принимая во внимание обоснованно возможные сценарии, взвешенные с учетом вероятности. Модель оценки ОКУ представляет собой оценку возмещаемой стоимости кредитной задолженности, основанной на методе дисконтирования ожидаемых будущих денежных потоков. Возмещаемая стоимость кредитной задолженности определяется Банком исходя из актуальных данных о платежеспособности клиентов, признаках их финансовой неустойчивости, внутреннего рейтинга должника, фактах нарушений графика платежей, ликвидности залогового обеспечения и другой релевантной информации. Рассматриваемые денежные потоки включают денежные потоки от продажи удерживаемого обеспечения или от других механизмов повышения кредитного качества, которые являются неотъемлемой частью договорных условий.<br>Формирование оценочного резерва под ОКУ на коллективной основе осуществляется по кредитному портфелю, разделенному на сегменты или субпортфели, объединенные по общим характеристикам кредитного риска. | Мы оценили Методику расчета величины резерва под обесценение финансовых активов, в частности, порядок расчета резерва по кредитам и авансам, предоставленным корпоративным клиентам, на предмет соответствия требованиям МСФО.<br>Мы оценили и проверили (на выборочной основе) организацию и эффективность функционирования средств внутреннего контроля в отношении данных, используемых в ходе расчета оценочного резерва под ОКУ по кредитам и авансам, предоставленным корпоративным клиентам, а именно: порядок авторизации кредитного договора и выдачи денежных средств; процедуру переноса данных из кредитных договоров в программные комплексы Банка; своевременный перенос просроченного долга на соответствующие счета по учету просроченной задолженности; передачу данных о погашениях задолженности в учетных системах; анализ наличия фактов реструктуризации задолженности в 2024 году и их влияния на определение стадии оценки ОКУ заёмщика; корректность расчета ожидаемых денежных потоков; обоснованность определения Банком стоимости залогового обеспечения, принимаемого в расчет, а также регулярность его мониторинга; корректность расчета внутреннего кредитного рейтинга заемщика, включая корректность данных использованных для расчета кредитного рейтинга заемщика; корректность применения рассчитанного LGD при оценке ОКУ.<br>Мы протестировали (на выборочной основе) расчет оценочного резерва под ОКУ по кредитам и авансам, предоставленным корпоративным клиентам, оцениваемым Банком на индивидуальной основе. Мы проверили список индивидуально значимых заемщиков, полученный от Банка, на полноту. Мы проанализировали (на выборочной основе) кредитные досье индивидуально значимых заемщиков, их последнюю финансовую отчетность, информацию о признаках финансовой неустойчивости и негативной информации, порядок обслуживания задолженности, факты нарушений графика платежей. Оценили ликвидность залогового обеспечения для тех кредитных договоров, где это было уместно. Для кредитов, отнесенных к Стадии 3, мы оценили (на выборочной основе) допущения, используемые при расчете будущих денежных потоков, включая оценку финансового состояния заемщиков, а также стратегию Банка по взысканию задолженности. |

| Ключевой вопрос аудита | Какие аудиторские процедуры были выполнены в отношении ключевого вопроса аудита |
|---|---|
| **Оценочный резерв под ожидаемые кредитные убытки по кредитам и авансам, предоставленным корпоративным клиентам в соответствии с МСФО (IFRS) 9 «Финансовые инструменты»** | |
| Ключевые параметры расчета резерва на коллективной основе:<br>- вероятность наступления дефолта контрагента (далее – «PD»). PD рассчитывается на основании качественных и количественных показателей корпоративных заемщиков на основе системы внутренних рейтингов Банка. Полученные показатели PD применяются с учетом макрофактора для учета текущих и будущих изменений в экономической среде;<br>- уровень потерь при дефолте (далее – «LGD»). LGD рассчитывается с использованием имеющейся исторической информации по возвратности по кредитным договорам клиентов и представляет собой оценку невозмещенной части актива за счет прогнозируемого денежного возмещения и возмещения за счет имеющегося обеспечения.<br>Примечания 2 «Существенные принципы учетной политики», 3 «Важные оценочные значения и суждения в применении учетной политики», 7 «Кредиты и авансы клиентам», а также 26 «Управление финансовыми рисками», включенные в финансовую отчетность, содержат подробную информацию об оценочных резервах под ожидаемые кредитные убытки по кредитам и авансам, предоставленным корпоративным клиентам. | Мы также протестировали расчет резерва под ОКУ по кредитам и авансам, предоставленным корпоративным клиентам, оцениваемым Банком на коллективной основе. Мы проанализировали используемые Банком PD и LGD. Мы пересчитали итоговый оценочный резерв под ОКУ для кредитов и авансов, предоставленных корпоративным клиентам, оцениваемых на коллективной основе.<br>Мы провели аналитические процедуры в отношении общей суммы резервов под ОКУ по кредитам клиентам: построили тренды; проанализировали отчет о разработке модели оценки PD корпоративных клиентов; проанализировали показатели модели оценки PD, характеризующие качество и обоснованность применяемой модели; проанализировали корреляции между изменениями объемов кредитного портфеля и созданных резервов под ОКУ; проверили корректность применяемого LGD; проверили правильность представления Банком в финансовой отчетности информации в отношении оценочного резерва под ОКУ по кредитам и авансам, предоставленным корпоративным клиентам. |

**Обязанности аудируемого лица по подготовке финансовой отчетности**

Руководство несет ответственность за подготовку и достоверное представление прилагаемой финансовой отчетности в соответствии с МСФО и организацию системы внутреннего контроля, которую руководство считает необходимой для подготовки финансовой отчетности, не содержащей существенных искажений, допущенных вследствие ошибок или недобросовестных действий.

При подготовке финансовой отчетности руководство Банка несет ответственность за оценку способности Банка продолжать непрерывно свою деятельность, за раскрытие в соответствующих случаях сведений, относящихся к непрерывности деятельности, и за составление отчетности на основе допущения о непрерывности деятельности, за исключением случаев, когда руководство намеревается ликвидировать Банк, прекратить его деятельность или когда у него отсутствует какая-либо иная реальная альтернатива, кроме ликвидации или прекращения деятельности.

Лица, наделенные руководящими полномочиями Банка, несут ответственность за осуществление надзора за процессом подготовки финансовой отчетности Банка.

**Обязанности аудиторской организации по проведению аудита финансовой отчетности**

Наша цель состоит в получении разумной уверенности в том, что финансовая отчетность Банка не содержит существенных искажений вследствие ошибок и (или) недобросовестных действий, и в составлении аудиторского заключения, содержащего выраженное в установленной форме аудиторское мнение. Разумная уверенность представляет собой высокую степень уверенности, но не является гарантией того, что аудит, проведенный в соответствии с требованиями Закона Республики Беларусь от 12 июля 2013 года № 56-З «Об аудиторской деятельности», национальными правилами аудиторской деятельности и Международными стандартами аудита позволяет выявить все имеющиеся существенные искажения. Искажения могут возникать в результате ошибок или недобросовестных действий и считаются существенными, если можно обоснованно предположить, что в отдельности или в совокупности они могут повлиять на экономические решения пользователей финансовой отчетности, принимаемые на ее основе.

В рамках аудита, проводимого в соответствии с требованиями Закона Республики Беларусь от 12 июля 2013 года № 56-З «Об аудиторской деятельности», национальных правил аудиторской деятельности и Международных стандартов аудита, мы применяем профессиональное суждение и сохраняем профессиональный скептицизм на протяжении всего аудита. Кроме того, мы выполняем следующее:

- выявляем и оцениваем риски существенного искажения финансовой отчетности вследствие недобросовестных действий или ошибок; разрабатываем и проводим аудиторские процедуры в ответ на эти риски; получаем аудиторские доказательства, являющиеся достаточными и надлежащими, чтобы служить основанием для выражения нашего аудиторского мнения. Риск необнаружения существенного искажения в результате недобросовестных действий выше, чем риск необнаружения существенного искажения в результате ошибки, так как недобросовестные действия, как правило, подразумевают наличие специально разработанных мер, направленных на их сокрытие;
- получаем понимание системы внутреннего контроля, имеющей значение для аудита, с целью разработки аудиторских процедур, соответствующих обстоятельствам, но не с целью выражения аудиторского мнения об эффективности системы внутреннего контроля Банка;
- оцениваем надлежащий характер применяемой учетной политики и обоснованность оценочных значений, рассчитанных руководством и соответствующего раскрытия информации;
- оцениваем правильность применения руководством допущения о непрерывности деятельности, а на основании полученных аудиторских доказательств делаем вывод о том, имеется ли существенная неопределенность в связи с событиями или условиями, в результате которых могут возникнуть значительные сомнения в способности Банка продолжать непрерывно свою деятельность. Если мы приходим к выводу о наличии существенной неопределенности, мы должны привлечь внимание в нашем аудиторском заключении к соответствующему раскрытию информации в финансовой отчетности или, если такое раскрытие информации является ненадлежащим, модифицировать наше аудиторское мнение. Наши выводы основаны на аудиторских доказательствах, полученных до даты нашего аудиторского заключения. Однако будущие события или условия могут привести к тому, что Банк утратит способность продолжать непрерывно свою деятельность;
- проводим оценку представления финансовой отчетности в целом, ее структуры и содержания, включая раскрытие информации, а также того, представляет ли финансовая отчетность лежащие в ее основе операции и события так, чтобы было обеспечено их достоверное представление.

Мы осуществляем информационное взаимодействие с лицами, отвечающими за корпоративное управление, доводя до их сведения, помимо прочего, информацию о запланированном объеме и сроках аудита, а также о значимых вопросах, возникших в ходе аудита, в том числе о значительных недостатках системы внутреннего контроля, которые мы выявляем в процессе аудита.

Мы предоставляем лицам, отвечающим за корпоративное управление заявление о том, что нами были выполнены все требования в отношении соблюдения принципа независимости и до сведения этих лиц была доведена информация обо всех взаимоотношениях и прочих вопросах, которые можно обоснованно считать угрозами нарушения принципа независимости, и, если необходимо, обо всех предпринятых мерах предосторожности.

Из числа вопросов, доведенных до сведения лиц, отвечающих за корпоративное управление, мы выбираем ключевые вопросы аудита и раскрываем эти вопросы в аудиторском заключении, кроме тех случаев, когда публичное раскрытие информации об этих вопросах запрещено законодательством или когда мы обоснованно приходим к выводу о том, что отрицательные последствия сообщения такой информации превысят общественно значимую пользу от ее раскрытия.

Руководитель задания,
руководитель аудиторской группы
Абойшева Анна Михайловна
Доверенность № б/н от 03.02.2025

Квалификационный аттестат аудитора № 0001351.
Свидетельство о соответствии квалификационным требованиям и требованиям к деловой репутации, предъявляемым к аудиторам, оказывающим аудиторские услуги в банках, банковских группах и банковских холдингах № 155.

**Аудиторская организация:**
Унитарное предприятие по оказанию услуг «АйКьюТи Эшуранс».
**Место нахождения:** г. Минск, пр-т Независимости, 32А, строение 3, этаж 10, пом. 73, 220030, Республика Беларусь.
**Сведения о государственной регистрации:**
зарегистрировано Минским городским исполнительным комитетом решением от 21 мая 2010 года, в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 191315745. Свидетельство о государственной регистрации № 0000520.
**Регистрационный номер записи в реестре аудиторских организаций:** 10065.

Дата подписания аудиторского заключения: 31 марта 2025 года.
Дата получения аудиторского заключения ЗАО «Альфа-Банк»: 31 марта 2025 года.

Председатель Правления ЗАО «Альфа-Банк»
Смоляк Валерий Степанович

# НА НАЙВЫШЭЙШЫМ УЗРОЎНІ ДАКЛАДНАСЦІ

## Як беларускія метролагі ствараюць і мадэрнізуюць нацыянальныя эталоны

Без метралогіі не змогуць рухацца цягнікі і ўзлятаць самалёты, не пабудаваць сучасны дом і не вырабіць новыя лекі. Гэта, бадай, самая дакладная з усіх навук, і прысвечана яна вымярэнням. Ад яе залежаць усе сферы чалавечага жыцця, звязаныя з мерамі і вагамі: ад гандлю да аховы прыроды. І, безумоўна, без метралогіі не абыходзіцца ні адна тэхнічная галіна сучаснай прамысловасці.





Дырэктар Аляксандр КАЗАЧОК.



Намеснік дырэктара Юрый ІВАНОЎ дэманструе нацыянальны эталон адзінак: часу - секунды, частаты - герца і шкалы часу.

## У ЛАБАРАТОРЫЯХ, АКАДЭМІЧНЫХ ІНСТЫТУТАХ І Ў ПОБЫЦЕ

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Беларускі дзяржаўны інстытут метралогіі» (БелДІМ) з'яўляецца Нацыянальным метралагічным інстытутам і ключавой метралагічнай арганізацыяй у нашай краіне. Ён выконвае ўласныя распрацоўкі і ўкараняе іх разам з сучаснымі дасягненнямі метралогіі ў нацыянальную эканоміку. У першую чаргу гэта датычыцца прамысловых прадпрыемстваў. Аднак да паслуг БелДІМ звяртаюцца і акадэмічныя інстытуты, навуковыя даследаванні якіх заснаваны на выніках дакладных вымярэнняў.

— Маючы ў сваім распараджэнні ўнікальныя вымяральныя тэхналогіі, прэцызійнае абсталяванне і высокакваліфікаваных метролагаў са шматгадовым вопытам работы, мы праводзім не толькі складаныя і высокадакладныя вымярэнні, але і даследаванні па нарміраванні метралагічных характарыстык сродкаў вымярэння, патрабаванняў да дакладнасці правядзення работ па паверцы і каліброўцы, а таксама распрацоўваем агульныя правілы нарміравання і ацэнкі дакладнасці тэхнічных вымярэнняў, — адзначае **дырэктар БелДІМ Аляксандр КАЗАЧОК.**

Інстытут вядзе сваю дзейнасць па трох асноўных структурных кірунках: метралогія, пацвярджэнне адпаведнасці і навука. БелДІМ распрацоўвае навукова-метадычныя асновы дзейнасці, прапановы па дзейнасці метралагічных службаў юрыдычных асоб і рэспубліканскіх органаў дзяржкіравання, метадалогіі забеспячэння адзінства вымярэнняў у галінах, праводзіць метралагічны аўдыт з мэтай аналізу стану вымярэнняў у адпаведнасці з патрабаваннямі заканадаўства аб забеспячэнні адзінства вымярэнняў пры вытворчасці прадукцыі, выкананні работ і аказанні паслуг.

Акрамя таго, інстытут аказвае паслугі арганізацыям як у Беларусі, так і за мяжой, у тым ліку заказчыкам з Расіі, Арменіі, Узбекістана, Казахстана, Грузіі, Кітая, Турцыі і некаторых іншых краін. База кліентаў БелДІМ складае больш за 20 тысяч заказчыкаў.

Найбольш распаўсюджанымі відамі паслуг, якія аказваюць метралагічныя падраздзяленні, з'яўляюцца дзяржаўная паверка, паверка, каліброўка, метралагічная экспертыза, выпрабаванні сродкаў вымярэння, а таксама атэстацыя выпрабавальнага абсталявання, правядзенне высокадакладных вымярэнняў. Метралагічныя паслугі ахопліваюць усе віды вымярэнняў і прадастаўляюцца арганізацыям 70 міністэрстваў і ведамстваў, а таксама юрыдычным асобам без ведамаснай прыналежнасці, якія размешчаны як у Беларусі, так і за яе межамі. Летась спецыялістамі інстытута было паверана больш за 1,2 мільёна сродкаў вымярэння, адкалібравана — каля 52 тысяч.

Па даручэннях Дзяржстандарта БелДІМ удзельнічае ў рабоце шэрага метралагічных арганізацый, такіх, як Міжнароднае бюро мер і вагаў, Міжнародная арганізацыя заканадаўчай метралогіі, арганізацыя Еўра-Азіяцкага супрацоўніцтва дзяржаўных метралагічных устаноў , Міждзяржаўны савет па стандартызацыі, метралогіі і сертыфікацыі. Беларускія метролагі выконваюць Дамоўленасці CIMP MRA ў частцы прызнання эталонаў і сертыфікатаў вымярэнняў і каліброўкі.



Начальнік аддзела геаметрычных вымярэнняў Уладзімір МАКАРЭВІЧ устанаўлівае эталоннае кольца для паверкі нутрамераў.



Начальнік вытворча-даследчага аддзела радыёэлектронных вымярэнняў Юрый ШАРШУН вымярае напружанне магнітнага поля.

## ЭТАЛОНЫ ДЛЯ АТАМНАЙ ЭНЕРГЕТЫКІ І ЛІЧБАВЫХ ТЭХНАЛОГІЙ

Эталоны ў метралогіі з'яўляюцца асновай дакладных вымярэнняў. Напрыклад, пры вытворчасці дэталяў вельмі важна, каб памеры строга адпавядалі пэўным стандартам. Эталоны дапамагаюць забяспечыць такую дакладнасць і ўніфікацыю. Адзін з найважнейшых навуковых кірункаў дзейнасці БелДІМ — стварэнне і мадэрнізацыя нацыянальных эталонаў. Сёння нацыянальная эталонная база, работа над якой пачалася 30 гадоў таму, уключае 68 эталонаў.

— Нацыянальная эталонная база распрацоўваецца на аснове правядзення навуковых і навукова-тэхнічных даследаванняў. У рамках дзяржаўнай навукова-тэхнічнай праграмы «Нацыянальныя эталоны і высокатэхналагічнае даследчыцкае абсталяванне» на 2021—2025 гады пры дзяржаўнай падтрымцы вядуцца новыя распрацоўкі і мадэрнізацыя існуючых эталонаў. У дзейнай праграме прадугледжвалася 15 заданняў, у выніку ўжо створана 5 нацыянальных эталонаў, адзін эталонны комплекс і мадэрнізавана 4 нацыянальныя эталоны. Вядуцца работы па стварэнні яшчэ 2 новых і мадэрнізацыі 3 эталонаў. Гэта добры зачын для далейшых навуковых даследаванняў па паляпшэнні характарыстык, пашырэння зоны прымянення нацыянальных эталонаў. Нашы спецыялісты ўдзельнічаюць у навукова-практычных канферэнцыях, семінарах, круглых сталах у Расіі, Казахстане, Узбекістане, Арменіі. У гэтым месяцы мы далучымся да работы міжнароднай навуковай канферэнцыі, прымеркаванай да 150-годдзя стварэння Палаты мер і вагаў. Пастаянна абменьваемся вопытам і пашыраем прафесійныя сувязі, — расказвае **намеснік дырэктара, кандыдат тэхнічных навук Юрый ІВАНОЎ.**

З 68 нацыянальных эталонаў 59 былі створаны спецыялістамі БелДІМ, яшчэ 9 — староннімі арганізацыямі. Напрыклад, Інстытут прыкладной фізікі Нацыянальнай акадэміі навук валодае чатырма нацыянальнымі эталонамі, такую ж колькасць мае і Інстытут фізікі імя Б. І. Сцяпанава Нацыянальнай акадэміі навук. Цяпер БелДІМ праводзіць работы па стварэнні новага эталона пад назвай «Нацыянальны эталон адзінак шчыльнасці патоку нейтронаў, магутнасці паглынутай і эквівалентнай доз нейтроннага выпраменьвання», які павінен быць гатовы сёлета. Ён будзе выкарыстоўвацца ў сферы атамнай энергетыкі.

У цэлым развіццё нацыянальнай эталоннай базы цесна звязана з прыярытэтнымі кірункамі навуковай, навукова-тэхнічнай і інавацыйнай дзейнасці, вызначанымі кіраўніком дзяржавы на перыяд да 2030 года. Гэта найбольш перспектыўныя і запатрабаваныя для краіны сферы дзейнасці: лічбавыя тэхналогіі і штучны інтэлект, інавацыйныя тэхналогіі ў прамысловасці, біялагічныя і медыцынскія тэхналогіі, інавацыйныя тэхналогіі ў аграпрамысловым комплексе і харчовай прамысловасці, навуковае і навукова-тэхнічнае забеспячэнне бяспекі чалавека, грамадства і дзяржавы. Напрыклад, за сферу інфармацыйных тэхналогій адказвае створаны ў БелДІМ Нацыянальны эталон адзінак вымярэння аб'ёмаў лічбавай інфармацыі, якая перадаецца па каналах Інтэрнэту і тэлефаніі. Ён забяспечвае сучасныя патрэбы беларускіх арганізацый у аднаўленні, захоўванні і перадачы адзінак вымярэння аб'ёмаў лічбавай інфармацыі, якая перадаецца і прымаецца рабочымі сродкамі вымярэнняў з мэтай забеспячэння адзінства і дакладнасці вымярэнняў.

Адным з самых значных з'яўляецца Нацыянальны эталон адзінак: часу — секунды, частаты — герца і шкалы часу, які забяспечвае патрэбы краіны ў эталонных сігналах часу і частаты. Ён створаны і эксплуатуецца вытворча-даследчыцкім аддзелам радыёэлектронных вымярэнняў БелДІМ. Гэта самы дакладны эталон часу. Па ім калібруюцца іншыя эталонныя крыніцы, што маюць многія арганізацыі, якім важны дакладны час.

— Сігналы дакладнага часу мы перадаём банкаўскай сістэме, Белтэлекаму, аператарам сувязі. А вось чыгунка мае свае другасныя эталонныя крыніцы частаты, і мы займаемся іх каліброўкай, — расказвае **начальнік аддзела Юрый ШАРШУН.**

Сёння аддзел выконвае тысячы вымярэнняў рознага прызначэння, займаецца рознымі відамі метралагічнай ацэнкі радыёэлектронных сродкаў вымярэння, сродкаў вымярэння часу і частаты, медыцынскага прызначэння, вымяральных сістэм, вымяральнікаў хуткасці транспарту. Спецыялісты аддзела аднымі з першых асвоілі метады метралагічнай ацэнкі сродкаў вымярэння медыцынскага прызначэння: электракардыёграфаў, пульсаксіметраў, медыцынскіх манітораў пацыента і фетальных манітораў, энцэфалографаў.



Намеснік дырэктара Таццяна ЯКУСЕВІЧ і начальнік вытворча-даследчага аддзела вымярэнняў механічных велічынь Наталля КАМКОВА абмяркоўваюць правядзенне работ па метралагічнай ацэнцы датчыкаў сілы і дынамометраў.



Нацыянальны эталон адзінкі шчыльнасці патоку энергіі электрамагнітнага поля.



Нацыянальны эталон адзінкі сілы.

## МЕТРЫЧНАЙ КАНВЕНЦЫІ — 150 ГАДОЎ!

**20 мая — Сусветны дзень метралогіі.** Гэта штогадовая ўрачыстая падзея, падчас якой адзначаецца ўплыў вымярэнняў на паўсядзённае жыццё кожнага з нас. Гэта дата была выбрана ў гонар падпісання 20 мая 1875 года Метрычнай канвенцыі — міжнароднага дагавора, які служыць для забеспячэння адзінства метралагічных стандартаў у розных краінах. Штогод Сусветны дзень метралогіі арганізуецца і адзначаецца Міжнародным бюро мер і вагаў сумесна з Міжнароднай арганізацыяй заканадаўчай метралогіі пры ўдзеле нацыянальных метралагічных арганізацый.

Сёлета юбілейная дата. У гэты дзень спаўняецца роўна 150 гадоў з моманту падпісання Метрычнай канвенцыі і стварэння Міжнароднага бюро мер і вагаў. Міжнародная метралагічная супольнасць імкнецца прыцягнуць увагу да кожнага Сусветнага дня метралогіі з дапамогай распаўсюджання тэматычных постараў і публікацый. Раней адзначаліся такія тэмы, як вымярэнні для вырашэння глабальнай энергетычнай праблемы, бяспекі, інавацый, а таксама вымярэнні ў спорце, ахове навакольнага асяроддзя, медыцыне і гандлі. Дэвіз сёлетняга Сусветнага дня метралогіі — «Вымярэнні на ўсе часы, для ўсіх людзей».

Метралогія немагчымая без пастаяннага міжнароднага супрацоўніцтва. У адваротным выпадку як пераканацца, што беларускія эталоны супадаюць з эталонамі іншых краін? Беларусь у 2003 годзе ўступіла ў Генеральную канферэнцыю па мерах і вагах, якая з'яўляецца вышэйшым органам Міжнароднага бюро мер і вагаў. А з 2020-га наша дзяржава з'яўляецца паўнапраўным членам Метрычнай канвенцыі, што разам з павышэннем міжнароднага даверу да нацыянальнай метралагічнай інфраструктуры садзейнічае ўмацаванню дамоўленасцяў аб безбар'ерным міжнародным гандлі, а таксама павышэнню канкурэнтаздольнасці айчыннай прадукцыі за кошт зніжэння выдаткаў на паўторныя вымярэнні, у тым ліку пры ўмове правядзення работ у адпаведнасці з гарманізаванымі стандартамі.

Удзел Беларусі ў дзейнасці Міжнароднага бюро мер і вагаў дае магчымасць зверкі ўласных нацыянальных эталонаў з міжнароднымі і атрымання міжнароднага прызнання нацыянальных эталонаў, а значыць і міжнароднага прызнання вынікаў вымярэнняў.

— Паўнапраўнае членства ў Міжнародным бюро мер і вагаў дае вялікія перавагі нашай краіне ў галіне метралогіі, а таксама перспектывы для рэальнага сектара эканомікі, — гаворыць **начальнік сектара тэарэтычнай метралогіі, навукова-тэхнічных праграм Вольга ШЭМАГОНАВА,** падкрэсліваючы, што ў гэтай міжнароднай арганізацыі збіраецца ўся інфармацыя і вядзецца міжнародная база KCDB, дзе прадстаўлены і найлепшыя беларускія вымяральныя і калібровачныя магчымасці — між іншым, на сёння гэта 301 CMC-радок.

Беларусь з'яўляецца і паўнапраўным членам Міжнароднай арганізацыі заканадаўчай метралогіі. Гэта дае магчымасць рыхтаваць і ўкараняць у практыку свае ТНПА ў галіне метралогіі. Акрамя таго, наша краіна ўваходзіць у Еўра-Азіяцкае супрацоўніцтва рэгіянальных метралагічных арганізацый (КООМЕТ), якое аб'ядноўвае 17 краін. Беларускія метролагі ўдзельнічаюць у дзейнасці тэхнічных камітэтаў па ўсіх відах вымярэнняў. Напрыклад, начальнік аддзела па электрычных велічынях БелДІМ Марына Ермаловіч з'яўляецца старшынёй аднаго з тэхнічных камітэтаў, ва ўсіх астатніх Беларусь таксама мае сваіх прадстаўнікоў. Вольга Шэмагонава прадстаўляе Беларусь у тэхнічным камітэце па інфармацыі і навучанні. У верасні наша краіна прыме пасяджэнне аднаго з тэхнічных камітэтаў — па тэрмаметрыі і цеплафізіцы.

— Удзел у дзейнасці КООМЕТ дазваляе нам ажыццяўляць зверку нацыянальных эталонаў і выходзіць на міжнародны ўзровень. Гэта рэгістрацыя нашых CMC-радкоў, пацвярджэнне нашых калібровачных і вымяральных магчымасцяў на міжнародным узроўні, — кажа Вольга Уладзіміраўна.

Бяруць удзел спецыялісты БелДІМ і ў дзейнасці рабочых груп і камісій яшчэ адной арганізацыі — Міждзяржаўнага савета па стандартызацыі, метралогіі і сертыфікацыі (МДС СНД). А што датычыцца геаграфіі супрацоўніцтва, то гэта шэраг краін СНД, Еўропы і Кітай.

— Апошнім часам мы актыўна супрацоўнічаем з Узбекістанам, нядаўна абнавілі пагадненне аб узаемаразуменні, цяпер прапрацоўваюцца пытанні па дарожнай карце сумесных мерапрыемстваў. Перападпісана аналагічнае пагадненне з Кыргызстанам, рыхтуецца перападпісанне з Азербайджанам. Пачалі актыўна супрацоўнічаць з Кітаем. Летась дэлегацыя БелДІМ наведала Нацыянальны метралагічны інстытут Кітая, пазнаёмілася з іх эталоннай базай, і цяпер ідзе прапрацоўка пытанняў, якія намечаны падчас паездкі. Цесна супрацоўнічаем з Расіяй, у прыватнасці, з Усерасійскім інстытутам метралогіі імя Д. І. Мендзялеева, нашы супрацоўнікі праходзяць там навучанне. Наладжваем супрацоўніцтва з В'етнамскім інстытутам метралогіі, накіравалі ім прапановы па цікавых для абодвух інстытутаў пытаннях, — пералічвае Вольга Шэмагонава, дадаючы, што геаграфія супрацоўніцтва пашыраецца і пастаянна ідзе пошук новых міжнародных партнёраў для навуковых праектаў.

**Алена КРАВЕЦ.**
**Алена ДАЎЖАНОК.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**





Начальнік сектара тэарэтычнай метралогіі, навукова-тэхнічных праграм Вольга ШЭМАГОНАВА разам з калектывам падчас работы.

УНП 100055197

КАНТЭКСТ

# НАГНЯТАННЕ НАПРУЖАНАСЦІ

## У Мінабароны пракаментавалі рашэнні суседніх краін аб выхадзе з Атаўскай канвенцыі


Фота БелТА.

Рашэнне Польшчы і краін Балтыі выйсці з Атаўскай канвенцыі вядзе да нагнятання напружанасці ў рэгіёне. Аб гэтым заявіў начальнік Дэпартамента міжнароднага ваеннага супрацоўніцтва — памочнік міністра абароны па пытаннях міжнароднага ваеннага супрацоўніцтва Валерый РАВЕНКА, паведаміла БелТА.

Дадзенае рашэнне — вельмі нелагічны крок. Яно з'яўляецца наступствам фобіі аб ваеннай пагрозе, якая нібыта выходзіць з боку Беларусі і Расіі. «У Польшчы і краінах Балтыі прыдумалі, што на іх нехта будзе нападаць, таму трэба тэрмінова выйсці з дадзенай канвенцыі. У той жа час Беларусь па гэтым пытанні выканала ўсе абавязацельствы. Мы скарацілі пэўную колькасць мін розных мадыфікацый, якія падпадаюць пад гэту канвенцыю», — адзначыў Валерый Равенка.

Начальнік Дэпартамента міжнароднага ваеннага супрацоўніцтва звярнуў увагу, што Беларусь узяла на сябе пэўныя абавязацельствы перад Арганізацыяй Аб'яднаных Нацый і выканала іх. Сярод дзяржаў, якія кантралявалі гэты працэс у Беларусі, была і Літва. «Калі Літва выступала за неабходнасць выканання палажэнняў канвенцыі, за скарачэнне колькасці супрацьпяхотных мін, навошта яна падтрымлівае выхад з гэтай канвенцыі?» — задаў заканамернае пытанне Валерый Равенка.

Такім чынам, канстатаваў ён, краіны, якія настойвалі на рэалізацыі палажэнняў Атаўскай канвенцыі, занялі цяпер прама супрацьлеглую пазіцыю. «Натуральна, мы гэта не падтрымліваем і лічым, што гэта нагнятанне напружанасці. Тым не менш разлічваем, што цвярозы сэнс возьме верх, і суседнія дзяржавы вернуцца да практыкі выканання абавязацельстваў у галіне абмежавання прымянення канкрэтных відаў узбраення», — падкрэсліў начальнік Дэпартамента міжнароднага ваеннага супрацоўніцтва.

На пытанне аб тым, наколькі дадзенае рашэнне Польшчы і краін Балтыі было самастойным, Валерый Равенка адказаў, што складана гаварыць пра гэта адназначна: «Цяжка гаварыць аб кансэнсусе ўсіх дзяржаў — членаў НАТА, ведаючы працэсы, якія адбываюцца ўнутры блока. У іх ужо намячаюцца супярэчнасці. Шэраг краін не падтрымлівае агульную палітыку НАТА — напрыклад, Венгрыя, Турцыя, ЗША. Вашынгтон цяпер і ўвогуле праводзіць незразумелую для іншых дзяржаў палітыку».



У той жа час краіны старой Еўропы спрабуюць аб'яднацца ў рамках НАТА, і найлепшай падставай для гэтага з'яўляецца русафобская пазіцыя, лічыць Валерый Равенка: «Ім патрэбна была пагроза, і яны яе знайшлі. Пагроза гэтая з боку Беларусі міфічная. Наша краіна выканала свае абавязацельствы ў рамках Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. Але краінам НАТА трэба было нешта прыдумаць, і яны прыдумалі сабе такую пагрозу з боку Беларусі і Расіі, якая нібыта іх аб'яднае і дасць магчымасць ажыццяўляць пераўзбраенне і развіваць абаронную прамысловасць».

Акрамя таго, падкрэсліў Валерый Равенка, барацьба з надуманай пагрозай з'яўляецца адной з магчымасцяў для палітыкаў краін НАТА ўтрымацца ва ўладзе — асабліва на фоне палітычных, эканамічных і іншых унутраных праблем. «Беларусь у сваю чаргу прымае захады, якія накіраваны на падтрыманне стабільнасці ў рэгіёне. І мы імкнёмся адсунуць пагрозу вайны. Еўропа ж, наадварот, нагнятае напружанасць павышэннем абаронных бюджэтаў, рознымі ваеннымі вучэннямі і нават гэтым рашэннем аб выхадзе з Атаўскай канвенцыі. Такім чынам Еўропа падкрэслівае: так, мы рыхтуемся да вайны. Гэта значыць, яны сапраўды рыхтуюцца да вайны. І вось гэта ўяўная кансалідацыя з'яўляецца спробай кіруючага класа ўтрымацца ва ўладзе», — рэзюмаваў начальнік Дэпартамента міжнароднага ваеннага супрацоўніцтва Мінабароны.

ГЕАПАЛІТЫКА

# «ЧОРТАЎ ТУЗІН»

## 13 кандыдатаў змагаюцца за прэзідэнцкае крэсла ў Польшчы

У нядзелю, 18 мая, у Польшчы пройдзе першы тур прэзідэнцкіх выбараў. Але, мяркуючы па рэйтынгах кандыдатаў, другога тура ўсё ж не пазбегнуць. Яшчэ адна спроба вызначыцца з палітычным лідарам можа адбыцца 1 чэрвеня. Ці будзе гэтая электаральная кампанія адлюстраваннем выбару простых палякаў і ці чакаць змены палітычнага курсу ў краіне-суседцы, спыталі ў эксперта.



Кампанія па выбарах прэзідэнта Польшчы набліжаецца да свайго завяршэння і праходзіць ва ўмовах напалу інфармацыйнай барацьбы паміж 13 прэтэндэнтамі на вышэйшую дзяржаўную пасаду. У медыяпрасторы ў прамым сэнсе слова іскрыць ад іх публічных заяў і вострых выказванняў па пытаннях унутранай і знешняй палітыкі, а таксама прапанаваных траекторый развіцця польскай дзяржавы ў поствыбарны перыяд.



На думку **намесніка старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах Алега ДЗЯЧЭНКІ,** жорсткая палеміка паміж саіскальнікамі прэзідэнцкага партфеля, безумоўна, адбіваецца на ваганнях грамадскай думкі:

— Рэйтынгі галоўных фаварытаў прэзідэнцкай гонкі то падымаюцца, то зніжаюцца, уводзячы ў стан шоку экспертаў і знаўцаў выбарчага працэсу, што яшчэ раз пацвярджае зменлівасць палітычных настрояў выбаршчыкаў, — акцэнтуе парламентарый. — Таму сёння цяжка адназначна спрагназаваць, хто з гэтых 13 удзельнікаў выбарчай кампаніі стане пераможцам, адбудзецца адзін тур галасавання ці ж выбаршчыкам прыйдзецца яшчэ раз у чэрвені з'явіцца на ўчасткі для паўторнага галасавання.

Суразмоўца канстатуе, што на бягучы момант па выніках апытанняў грамадскай думкі вызначылася трое палітыкаў, якія карыстаюцца найбольшымі сімпатыямі польскіх грамадзян: мэр Варшавы Рафал Тшаскоўскі, які прадстаўляе інтарэсы «Грамадзянскай платформы», далей — вылучэнец кансерватараў з «Права і справядлівасці» Караль Наўроцкі і, нарэшце, кандыдат ад вельмі правай партыі «Канфедэрацыя свабоды і незалежнасці» Славамір Ментцэн.

— У фокусе разгорнутай імі палемікі — узаемаадносіны Польшчы з Еўрасаюзам, знешняя палітыка ў дачыненні да Расіі, Беларусі і Саюзнай дзяржавы ў цэлым, эскалацыя баявых дзеянняў у паўднёва-ўсходняй Украіне і праблемы з украінскімі імігрантамі, паглыбленне эканамічнага крызісу і рост беднасці насельніцтва на фоне павелічэння выдаткаў на ваенныя патрэбы, спусташэнне з прычыны санкцыйнай палітыкі дробнага і сярэдняга бізнесу, у тым ліку ў польска-беларускім памежжы, узмацненне эканамічнай і палітычнай залежнасці Варшавы ад Страсбурга і Вашынгтона, ператварэнне краіны і шэраг іншых надзённых для звычайных абывацеляў тэм, — тлумачыць эксперт.

Ён звяртае ўвагу на тое, што перадвыбарная рыторыка, а таксама «чортаў тузін» удзельнікаў выбарчай кампаніі стварае як унутры краіны, так і за мяжой ілюзію дэмакратычнасці выбараў, іх празрыстасці і справядлівасці.

— Аднак разумныя палякі ўсё часцей задаюць пытанне: ці могуць быць свабоднымі і дэмакратычнымі выбары ва ўмовах усё большай мілітарызацыі дзяржавы, агрэсіўных паводзін ваенна-палітычнага блока НАТА, размяшчэння ў краіне 10-тысячнага амерыканскага вайсковага кантынгенту і дакучлівай прысутнасці ў грамадска-палітычным жыцці прадстаўнікоў амерыканскіх разведвальных органаў? — падкрэслівае парламентарый.

Алег Дзячэнка перакананы: простыя людзі добра памятаюць пра сакрэтныя турмы для ўтрымання асоб, якія падазраюцца ў тэрарызме, створаныя ў ліхія двухтысячныя гады ў Польшчы супрацоўнікамі з Цэнтральнага разведупраўлення:

— Тады справа аб парушэнні правоў чалавека нават дайшла да Еўрапейскага суда ў Страсбургу, — нагадвае ён. — Практыка паказвае, што і сёння амерыканскія спецслужбы працягваюць зладжана ўзаемадзейнічаць з польскімі ўладамі, прычым адчуваюць сябе ў краіне ўпэўнена і вельмі прывольна.

На думку суразмоўцы, мінулыя дзесяцігоддзі наглядна пацвердзілі, што амерыканцы і заходнееўрапейцы не шкадуюць намаганняў для ўмацавання свайго становішча ў краінах былога сацыялістычнага блока і ўсё робяць для ўтрымання кантролю над імі.

— Адзін з апрабаваных інструментаў — правядзенне нібыта свабодных выбараў, — адзначае эксперт. — Аднак за іх кулісамі, як правіла, стаяць вопытныя рэжысёры з заакіянскай метраполіі, якія назапасілі велізарны досвед умяшання ва ўнутраныя справы іншых краін з дапамогай інфармацыйна-ідэалагічнага ўздзеяння на выбаршчыкаў, маніпулявання грамадскай свядомасцю, а дзе сітуацыя становіцца некіравальнай — то і праз «каляровыя рэвалюцыі» і «гібрыдныя войны», якія ажыццяўляюцца пад сцягам прымусу да «дэмакратыі».

Ён звяртае ўвагу на той факт, што імкненне амерыканцаў (якое не ўяўляе сакрэту ні для каго) захаваць сваё дамінаванне ў гэтым рэгіёне планеты і рэальны лёс краіны на найбліжэйшую пяцігодку будзе вызначацца не на Вісле, а на берагах Патамака.

— Таму не будзем мець ілюзій — знешняя палітыка нашага заходняга суседа, што кіруецца заакіянскімі палітыкамі, у найбліжэйшы час наўрад ці зменіцца ў лепшы бок, — канстатуе намеснік старшыні профільнай камісіі Палаты прадстаўнікоў.

У завяршэнне ён акцэнтуе ўвагу на тым, што, нягледзячы на гэта, наша краіна па-ранейшаму адкрыта для народа Польшчы і гатовая ўзаемадзейнічаць з дружалюбнымі нам палітычнымі сіламі, з той часткай грамадскасці, для якой важны не шлях да далейшай бессэнсоўнай канфрантацыі, а характэрна імкненне да аднаўлення ўзаемавыгаднага гандлёва-эканамічнага і грамадска-палітычнага супрацоўніцтва, да стабільнасці ў міждзяржаўных адносінах на аснове прынцыпаў мірнага суіснавання.

ВЫСТАЎКА

# ШТО ПРАПАНУЕ НАВЕДВАЛЬНІКАМ НОВЫ МВЦ?

## З 21 мая мінчане і госці сталіцы змогуць убачыць адразу дзве выстаўкі ў цэнтры «БелЭкспа»

8 мая, напярэдадні святкавання 80-годдзя Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне, Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, як і абяцаў прадстаўнікам працоўных калектываў Мінскага гарадскога тэхнапарка ў студзені гэтага года, афіцыйна адкрыў унікальны Мінскі міжнародны выставачны цэнтр. Чаму ўнікальны? Таму што гэта сапраўды грандыёзнае двухпавярховае збудаванне, якое не мае аналагаў у Беларусі, агульная плошча якога (закрытая і адкрытая часткі) складае больш за 37 тысяч квадратных метраў.





Сімвалічна, што першай выставай у афіцыйна адкрытым цэнтры стала часовая экспазіцыя «Дарога да Перамогі», прымеркаваная да 80-годдзя Перамогі. Звыш 600 экспанатаў з фондаў Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны расказваюць пра найважнейшыя падзеі Вялікай Айчыннай вайны. У храналагічнай паслядоўнасці наведвальнікі могуць убачыць момант вераломнага нападу нацысцкай Германіі, гераічную абарону Брэсцкай крэпасці, партызанскі побыт, бітву за Маскву, Курскую бітву, вызваленне Беларусі і ацаніць, колькі пакут і гора прынеслі нацысцкія акупанты на беларускую зямлю. А завяршае экспазіцыю штурм Берліна і, вядома ж, знакаміты Парад Перамогі ў Маскве ў чэрвені 1945 года. І ўсё суправаджаецца вялікай колькасцю мультымедыйных аб'ектаў з дапоўненай рэальнасцю, якія дазваляюць акунуцца ў атмасферу тых падзей.

Плануецца, што часовая экспазіцыя «Дарога да Перамогі» будзе працаваць да 5 ліпеня.

А ўжо 21 мая ў суседняй зале адкрыецца XII Міжнародная выстаўка ўзбраення і ваеннай тэхнікі MILEX-2025. З некаторымі яе экспанатамі ўжо паспелі азнаёміцца мінчане і госці сталіцы, якія наведвалі з 8 да 11 мая адкрыты выставачны цэнтр. Цяпер ідзе будаўніцтва стэндаў замежных кампаній, таму зала з ваеннай экспазіцыяй пакуль зачынена.

Сёлетняя выстаўка MILEX прадставіць шырокі спектр тэхналогій, накіраваных на забеспячэнне бяспекі дзяржавы, абароны і аховы дзяржаўнай граніцы. Плануюцца і вялікая колькасць мерапрыемстваў дзелавой праграмы. Шырока будзе прадстаўлена экспазіцыя беларускай і замежнай беспілотнай тэхнікі паветранага і наземнага прызначэння, стралковага ўзбраення, аптычных прыцэлаў і оптыка-электронных прыбораў назірання, сучасных сістэм аховы перыметра, відэаназірання і распазнавання асоб, ракетнага ўзбраення і супрацьтанкавыя комплексы, найноўшыя гранатамётныя комплексы. Асаблівай увагі заслугоўваюць рабатызаваныя баявыя модулі і сродкі сувязі і кіравання.

На адкрытай пляцоўцы прадстаўлены сучасныя ўзоры беларускай тэхнікі ваеннага і двайнога прызначэння. Тут і лёгкабраніраваная тэхніка, і суперсучасныя радыёлакацыйныя станцыі, комплексы радыёэлектроннай барацьбы і разведкі, магутны няядзерны сродак Узбраенне — РСЗА «Паланэз», мадэрнізаваныя зенітна-ракетныя комплексы і многае іншае, чым можа ганарыцца беларускі ваенна-прамысловы комплекс.

**Сяргей ЧЫЧЫЛАЎ.**
**Фота аўтара і Віктара ІВАНЧЫКАВА**

## 15 МАЯ — Даты. Падзеі. Людзі

**У краіне**

**1854** год — нарадзіўся (в. Свольна, цяпер у Верхнядзвінскім раёне) Іван Дзяменцьевіч Чэрскі, геолаг, географ, даследчык Сібіры. У 1871 годзе запрошаны Сібірскім аддзяленнем Рускага геаграфічнага таварыства ў Іркуцк. Праводзіў геалагічныя і палеанталагічныя даследаванні ў Саянах, Прыбайкаллі, у басейне Ангары і Ніжняй Тунгускі. Склаў першую геалагічную карту ўзбярэжжа возера Байкал. У 1891-м узначаліў экспедыцыю ў раён рэк Калыма і Індыгірка. Сёння яго імем названы сістэма горных хрыбтоў у Паўночна-Усходняй Сібіры, хрыбет у Забайкаллі і інш.

**1914** год — нарадзіўся Мікалай Васільевіч Гурло, беларускі мастак-графік. Працаваў у жанры плаката, станковай, сатырычнай і кніжнай графікі. Аўтар шматлікіх сатырычных малюнкаў для выдання «Раздавім фашысцкую гадзіну!», гумарыстычных і сатырычных малюнкаў для часопісаў «Вожык», «Полымя», «Работніца і сялянка», «Беларусь».

**1950** год — нарадзіўся Аляксей Уладзіміравіч Белы, беларускі вучоны, член-карэспандэнт НАН Беларусі, доктар тэхнічных навук, прафесар. Скончыў Маскоўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя М. В. Ламаносава. Аўтар звыш 200 навуковых прац у галіне матэрыялазнаўства, фізікі паверхняў, трыбатэхнікі. Зрабіў значны ўнёсак у даследаванне фізікі ўзаемадзеяння securing зараджаных часціц з паверхневымі пластамі цвёрдых цел. Лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола, Дзяржаўнай прэміі Беларусі.

**1979** год — у Мінску пры Інстытуце мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі адкрыты Музей старажытнабеларускай культуры. У аснову музейнага збору былі пакладзены калекцыі, сабраныя за многія гады супрацоўнікамі інстытута ў час мастацтвазнаўчых і этнаграфічных экспедыцый па ўсёй Беларусі. Найбольш значныя калекцыі: археалогіі, тканін і народнага касцюма XIX — пачатку XX стст., іканапісу, сакральнай і мемарыяльнай скульптуры XVI—XIX стст., нумізматыкі, старадрукаваных кніг і гравюр, вялікі архіў фотанегатываў помнікаў культуры і мастацтва Беларусі.

**У свеце**

**1618** год — нямецкі астраном Іаган Кеплер адкрыў законы руху планет. Гэтыя працы апісваюць ідэалізаваную геліяцэнтрычную арбіту планеты. Суадносіны Кеплера дазволілі Ньютану пастуляваць закон сусветнага прыцягнення, які стаў фундаментальным у класічнай механіцы.

**1845** год — нарадзіўся Ілья Ільіч Мечнікаў, расійскі біёлаг, ганаровы член Пецярбургскай акадэміі навук, многіх замежных АН і навуковых таварыстваў. Адзін з заснавальнікаў параўнальнай паталогіі, эвалюцыйнай эмбрыялогіі, мікрабіялогіі і імуналогіі. У 1886 годзе арганізаваў першую ў Расіі бактэрыялагічную станцыю. Аўтар работ па пытаннях старэння. Стварыў рускую школу мікрабіёлагаў, імунолагаў і паталагаў. Лаўрэат Нобелеўскай прэміі.

## Надвор'е на заўтра

| Горад | Ціск | Ноччу | Днём |
|---|---|---|---|
| МІНСК | 755 мм рт.сл. | +2..+4°C | +8..+10°C |
| ВІЦЕБСК | 756 мм рт.сл. | +5..+6°C | +10..+11°C |
| МАГІЛЁЎ | 757 мм рт.сл. | +4..+5°C | +11..+12°C |
| ГОМЕЛЬ | 759 мм рт.сл. | +5..+6°C | +12..+14°C |
| ГРОДНА | 752 мм рт.сл. | +4..+5°C | +8..+9°C |
| БРЭСТ | 754 мм рт.сл. | +5..+6°C | +10..+11°C |

Паводле даных Белгідрамета

**Месяц**
*Поўня 12.05—19.05. Месяц у сузор'і Стральца.*

**Геамагнітныя ўзрушэнні**




Абазначэнні:
— няма прыкметных геамагнітных узрушэнняў
— невялікія геамагнітныя ўзрушэнні
— слабая геамагнітная бура
— малая геамагнітная бура

**Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь выказвае глыбокае спачуванне Вадзіму Францавічу Гігіну, генеральнаму дырэктару дзяржаўнай установы «Нацыянальная бібліятэка Беларусі», у сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю МАЦІ.**

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар АНУФРЫЕВА Вольга Аляксандраўна.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by
для зваротаў: zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.Тыраж 10 951. Індэкс 63850. Зак. № 1048.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 14 мая 2025 года.